Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Мінскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 30 1932 г. № 291 (4543)

ГОД ВЫДАЧЫ XVI

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Пяцігодка стварыла новы тып чалавека. ЕНУКІДЗЕ — Дзесяцігодзьдзе Саюзу ССР (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ — Дзьве газэты (2 стар.).

Тысячамі тон ільнавалакна сустрэнем другую пяцігодку (1 стар.).

Тэмпы збожжазагатовак усё яшчэ не забясьпечваюць выкананьня пляну ў вызначаны тэрмін (2 стар.).

Карэспандэнцкі: МЯЖЗОЧ — Дзе страча на ліквідацыі пачуцьцё (2 стар.).

Л. М. — Не 4, а 24 тоны ў дзень (1 стар.).

ЛІСТЫ РАЗЕЛЬКОРАЎ (3 стар.)

Германскі пралетарыят абраблен на 23 млрд. марак (4 стар.).

Жупаны малюкам голаду ў Польшчы (4 стар.)

Бай ў раёне Нашіну (4 стар.).

ПЯЦІГОДКА СТВАРЫЛА НОВЫ ТЫП ЧАЛАВЕКА

Першага студзеня — дзень ударніка

Выдатнае значэньне гэтага дня вызначаецца тым, што ён зьяўляецца рубяжом дзьвух пяцігодак. Напярэдадні усім крупасьцям і напярэдадні усім ворагам першая пяцігодка пераможна завершана. Вялікі гонар выкананьня пяцігодкі за чатыры гады належыць ударніку, вернай апоры нашай партыі ў жыцьцяўленьні шырокіх і сьмелых яе плянаў пабудовы сацыялізму.

Ударнік — гэта слова вестае ўвесь сьвет, яно вымаўляюць на ўсіх канцах сьвету — адны з захапленьнем, другія з нянавісьцю. І ня дзіва, бо ў гэтым слове заключаецца вялікі сымбаль сацыялістычнага будаўніцтва, якое мае на ўсім сьвеце шмат адданых прыхільнікаў і шмат заклятых ворагаў.

Ударнік зьявіўся разам з пяцігодкай. Пяцігодка зрабіла вялікарны пераварот у эканамічным ладзе нашай краіны, завяршыўшы пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

У бэтоне і мэтале, у перапакляным абсталяваньні новых сацыялістычных прадпрыемстваў увасоблена гераічная праца ўдарнікаў. Гэта ўдарнікі асілілі стыхію Дняпра, непераможнасьць якой праслаўлена пазтамі. Гэта яны прарвалися ў нетры гары Магнітнай, здужалі буранны Сібіры і стварылі ў глухім краі найвялізнымі заводы-гіганты. Нашто не магло сьпіць лавіны гэтага бяспрыкладнага наступленьня: ні надзвычайная сьпякота, ні ледзяны холад, ні падкопы ворагаў, ні паразьнякства малавераў. Рабочая клясa, пад кіраўніцтвам партыі, прарвалася да мэты праз усе перашкоды. **У гісторыі чалавецтва і нават у эпосе народаў няма прыкладу, які-б мог параўнацца з гераізмам твораў пяцігодкі.**

Той-жа рэвалюцыйны запал і не адступаючую ні перад чым упартасьць, ударнікі ўносьлі і ў аўладаньне тэхнікай — у новапабудаваныя і рэканструяваныя прадпрыемствы. Мы ўжо маем тысячы прыкладаў, як ударнікі бліскуча аўладалі новымі машынамі і перавысілі амэрыканскія нормы выпрацоўкі. Даволі паказаць на СТЗ, ХТЗ і аўтазавод імя Сталіна, якія маюць безьліч падобных фактаў.

Пяцігодка — гэта ня толькі найпышнейшае гаспадарчае будаўніцтва. Яна азначае таксама і вялізнае перавыхаваньне людзей. **Пяцігодка стварыла ня толькі заводы і машыны. Яна стварыла таксама і новы тып чалавека.**

Ударнік — вось гэта новы чалавек, будаўнік сацыялістычнага грамадзтва, — рабочы, які скінуў з сябе ярмо капіталізму, які ўсьвядомлены сябе гаспадаром краіны, гаспадаром прамысловасьці і які самаадданa працуе над пабудовай сацыялістычнага грамадзтва.

Ударнік зьяўляецца загалкай для людзей буржуазнага літэру, яе папыралася пераканаўньне, што сацыялізм нібы пазбаўляе людзей стымулу да працы. Абмежаваны рынак буржуа бачыць адзіны стымул у пагоні за прыбыткамі і эксплёатацыю рабочых лічыць адзіна-магчымай формай прадукцыйнасьці працы. Але вось у Савецкім саюзе эксплёатацыя зьнічожана, а прадукцыйнасьць працы ня толькі не зьмяншаецца, але сыстэматычна ўзьнімаецца. У заключэньне ўсяго, як з-пад зямлі вырас трохмільённы пласт ударнікаў, антуразістаў працы, якія паказваюць цуды тэмпаў.

Кругавід буржуазнага сьветагляду заняпала вушкі, каб уміскіць даўно адкрытую тэарэтыкамі пралетарыяту, а цяпер доказаную на практыцы пашыкі ўдарнікамі ісьціну, што сацыялізм стварае невычэрпныя стымулі да ўзьнятага прадукцыйнасьці працы, галоўным з якіх зьяўляецца ўсьведамленьне таго, што рабочыя працуюць не на капіталістаў, а на сябе, на свае дзяржаву.

Ударнік зьяўляецца жывым прыкладам і ўзорам сацыялістычнай дысцыпліны працы, якая складае краеугольны камень новага ладу. Буржуазная проса ў свой час з пенай на губах крычала аб «нязьдольнасьці» бальшавікоў стварыць якую-б там ні была дысцыпліну. Рэакцыянеры ўсіх краін ганьбілі нашу рэвалюцыю, распускаючы пагалоскі, што рабочыя разбураюць усё і загубяць прамысловасьць.

Жыцьцё паказала, што рэвалюцыя ўмела ня толькі ўшчэнт ламаць старое, але і памайстарску будаваць новае. Рабочая клясa выцягнула прамысловасьць з нетраў разрухі, увяскрасіла з попелу і абломкаў і вывела на недасягную вышыню. Вырашыць та кую гігантскую задачу ўдалося толькі дзякуючы таму, што рабочыя стварылі моцную працоўную дысцыпліну. Гэта зьяўляецца відочным фактам і яго ня ў стане замаўляць нават нашы ворагі.

Сацыялістычная дысцыпліна цьвятраль на процілегла дысцыпліне капіталістычнага прадпрыемства. Тая дысцыпліна заснавана на **панскім прымушэньні**. Сацыялістычная-ж дысцыпліна заснавана на сьвядомасьці рабочых. Практычным выражэньнем сьвядомай дысцыпліны зьяўляецца сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, якое ахапіла па ініцыятыве нашай баявой рэвалюцыйнай моладзі найпышнейшыя масы рабочых і стала асноўным сродкам бальшавіцкіх тэмпаў. Спаборніцтва стала асноўным мэтадам сацыялістычнага выхаваньня рабочай клясы, асабліва новых рабочых, выхаванай з вёскі. Сіла і посьпех сацыялістычнага спаборніцтва настолькі вяліканы, што яно прасякнула і ў вёскі, саўгасы і калгасы.

Ні сьвядомая дысцыпліна, ні спаборніцтва немагчымы пры капіталізме, дзе праца служыць мэтай нажывы эксплёататараў. Сьвядомая дысцыпліна і спаборніцтва зьяўляецца тады, калі праца становіцца справай вызваленьня рабочае клясы ад ярма капіталізму, справай сацыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму праца пры капіталізме зьяўляецца цяжарам для рабочага, а пасьля зьвяржэньня ўлады буржуазіі становіцца гаварочай справай. Рабочая клясa, вызваліўшыся ад ярма эксплёататараў, узляміла і ўзвысіла працу і пераўтварыла яе «з ганебнага і цяжкага ярма, якім яна лічылася раней, у справу гонару, у справу славы, у справу адвагі і гераізма». Гэтыя словы тав. Сталіна, правадыра партыі і першага ўдарніка рабочай клясы, зьяўляюцца сьцягам ударнага руху.

Сьвядомая працоўная дысцыпліна не знаходзіцца ні ў якай супярэчнасьці з мерамі эканамічнага прымушэньня, якія пралетарская дзяржава ўжывае супроць нешкодных элемэнтаў з рабочых, у прыватнасьці прагульшчыкаў.

Мы бязьлітасны і будзем бязьлітаснымі ня толькі да эксплёататараў, але і да кожнага з нашага ўласнага асяродзьдзя, хто папрабуе пахіснуць нашу дысцыпліну. Суровыя меры барацьбы з прагульшчыкамі, дэзэртаваньня з працы савецкай улады, зьяўляюцца зусім неабходнымі і знаходзяцца ў поўнай адпаведнасьці з ленінскім разуменьнем барацьбы за ўстанаўленьне працоўнай дысцыпліны.

Ужываючы жорсткія меры супроць прагульшчыкаў, гультаёў і дэзэртараў, савецкая ўлада ўмее цаніць тых работнікаў, якія аддаюць усе сілы і ўменьне справе бальшавіцкіх тэмпаў. Ударніку ў сацыялістычнае — гонар і першае месца ўсюды і ва ўсім.

Праўда, гэты прынцып на практыцы ў некаторых выпадках парушаецца і па віне мясцовых гаспадарчых кіраўнікоў, і прафсаюзных арганізацый падмяняюцца «лявацкай» уравнялаўкай. Апошнія з важнейшых задач масавай работы ў сувязі з ідэяй ударніка павінна быць дакладная праверка практычнага ажыцьцяўленьня ўказанага прынцыпу і рашучае зьнішчэньне ўраўнілаўкі, а таксама ачышчэньне радаў ударнага руху ад ідэя-ўраўнілаўкі.

Першая пяцігодка закончана.

Няхай жыве другая пяцігодка!

Няхай жыве ударнік — гераічны будаўнік сацыялістычнага грамадзтва!

(Скарочаная перадавая «Правды», перададзеная па радыё).

Хоць план мясазагатовак і выкананы...

— Як у вас стаіць справа з загатоўкай мяса? — запыталі мы ў кіраўніка Чэрвеньскага раёну.

— Лепш, чым з загатоўкай збожжа і бульбы. Квартальны плян амаль поўнасьцю выкананы, — адказалі яны.

— А чаму-ж у раёне лічыцца так многа нядатчыкаў?

— Таму, што многія сяляне здалі адразу за год, а некаторыя зусім не здавалі.

І тут яны выдалі сябе з галавою. Палік паказаў, што гадавы плян выканалі на больш 20 проц. сялян, а 80 проц., або здалі зусім нязначную частку, або зусім не здавалі. Як бачыце, словы «многія» і «некаторыя» прыхоўваюць памяньць месцамі.

У чым-жа справа, чаму так здарылася? Перш за ўсё тут яе сябе атчуваць самацёк у рабоце. Людзі думалі: «раз плян выкананы, значыць няма аб чым турбавацца». Аднак, яны глыбока памыліліся. Самацёк, які мае месца зараз, можа прывесьці вялікія труднасьці ў выкананьні пляну 1933 году.

Асабліва неакуратнымі здатчыкамі мяса аказаліся саўгасы. Яны таксама схавалі ад агульны пропант выкананьня пляну па раёну і толькі таму, што з боку раённага кіраўніцтва ня было належнага кантролю.

Узяць хоць-бы саўгас «Будзённавец». Ён замест 530 цэнтн. мяса паводле пляну, здаў толькі 224 цэнтн.

— Ну, а як-жа з рэштаю мяса? — запыталі мы ў дырэктара саўгасу Труса.

— Ня ведаю, — прызнецца прасіць урад, каб зьнялі, бо няма чаго здаваць.

— Як, заданьне нерэальнае ці што?

Дырэктар падсукае плячыма, ня ведае, што адказаць. Ён адчувае, што сам вінават кругом, але прызнацца ў гэтым ня хоча.

Для ясьнасьці падамо толькі адну даведку.

Справа ў тым, што пры дачы вестак аб наяўнасьці сьвіняга стала двухмесячныя парасяты, так званыя «адзёмышы», былі занесены ў графу «адкормачных». Выходзячы з гэтага, саўгасу было дана заданьне на здачу мяса. І калі зараз поўнасьцю яго выканаць, то трэба здаць усіх сьвіней і нават частку кароў.

Хто вінават у гэтым? Дырэктар абвінавачвае Сьвінавотрэст, трэст — дырэктара. Нарэшце, «спайшлі» «вінаватага». І каго-б вы думалі? Статыстыка. Ён, бачыце, «падвёў» даверлівае начальства.

На самой-жа справе тут яўнае ашуканства. Калі трэба было атрымаць крэдыты, саўгас паранашу паказаць больш пагалоўя адкормачных сьвіней. А далей — трава не расьці. «Саўгас дзяржаўны, загатоўкі таксама, не дадуць-жа разваліць саўгасу і лішняе зьнімуць». Нас вядзіўле толькі адно, чаму да гэтага часу ня зьнят Трус з пасады дырэктара.

Цепалёка атыпоў і дырэктар саўгасу «Маладая гвардыя». Замест здачы мяса дзяржаве ў лік заданьня, ён прадаў Загражыцьле 50 цэнтн. па камэрцыйных цэнах. Ня выканалі сваіх заданьняў па здачы мяса і многія калгасы раёну.

Ці можна пасьля гэтых фактаў прызнаць ход загатовак мяса ў Чэрвеньскім раёне здавальняючым? Зразумела, не, хаця квартальны плян «амаль поўнасьцю выкананы». Кіраўніцтва раёну павінна зрабіць адсюль паўныя вывады: ліквідаваць самацёк і арганізаваць загатоўкі такім чынам, каб не засталося ні адной гаспадаркі, ня выкананай квартальнага пляну здачы мяса.

Ф.

ТЫСЯЧАМІ ТОН ІЛЬНАВАЛАКНА СУСТРЭНЕМ ДРУГУЮ ПЯЦІГОДКУ

ДА 1-га СТУДЗЕНЯ ЗДАЦЬ НЯ МЕНШ 80 проц. ГАДАВОГА ПЛЯНУ

Не 4, а 24 тоны ў дзень!

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Дырэктар Вушацкай МТС тав. Сіваграк ганарыцца сваёй інтымытыўнай.

— Для таго, каб не адпраўлялі дарма калгасных фурманак з нізкапрыкасным ільном назад, МТС рашыла пасьлаць у калгасы сартыроўшчыкаў, прыёмшчыкаў, — гаворыць Сіваграк.

МТС зараз гаспадар заводу. Слоў няма, «ініцыятыва» Сіваграка каштоўная, але... надзвычай спэцыяльная. Ня тыдзень дзьве назад, а яшчэ вясной было відома, што МТС зьвяртаецца арганізатарам ільназагатовак па калгасах. Яна зьвязана была дагаворам з ільнаводам. МТС на чале з дырэктарам Сівагракам пасе адказнасьць за ільназагатоўкі.

Бачыце, ня зьнімаецца віна з МТС і за тое, што з Вушацкага ільнавазоду на працягу загатоўчай кампаніі было вернута з «спаборніцкаспай практыкі» зьнім 1.500 вазоў (аб чым «Зьвязда» пісала ўжо). Дырэктар МТС прызнае сваю віну і выпраўляе, праўда, з вялікім спазьненьнем.

Характэрна падкрэсьліць, чым тлумачылася дзейнасьць дырэктара ільнаводу Стаховіча пры наяўнай павялічанай брацоўцы ільну, — імкненьнем застрахавацца ад бесгаспадарчасьці пры правяденьні гаспакарнага разрахунку на заводзе.

Ініцыятар гэтай «тэорыі», дырэктар заводу Стаховіч зараз зьнят з работы, выключан з партыі і аддаецца пад суд. Пакаранье на заслугах. Трэба толькі праверыць увесь склад работнікаў заводу, асабліва прыёмшчыкаў, вызваліцца ад клясава-варожых элемэнтаў, якія там засеялі. Пакульжа раённыя арганізацыі, у прыватнасьці райКК, усю сваю ўвагу зьвярнулі толькі на аднаго дырэктара.

Аналёгічныя факты злачынных адносін да ільназагатоўкаў наглядаюцца і на загатоўках Вушацкай канторы загатільну ў м. Вушачы. Вось яркі прыклад.

25 сьнежня загатпункт навезьвіў загадчык сэктару таўкультур Ушаўкамасіна тав. Зонтэйн, які прысутнічаў пры прыёмцы. Яму адразу кінулася ў вочы, што апэнка працуючы рэзка паніжаецца супроць сапраўднага яе кошту. Напрыклад, высокаякасная купюра прымаецца пад № 4, тав. Зонтэйн-жа вызначыў № 8, як мінімум — № 6. Ён усяго ўзоры гэтай купюры і валакна, якое прыйшла пад № 9. Узяў яна таго, каб праверыць у Полацку, атрымаць зноўку спэцыялістаў цэнтральнай ільнабазы. У гэты-ж дзень пробы былі праверены. І вынялася, што эксперыментная купюра, прынятая ў Вушачах пад № 4, сапраўды адпавядае спэцыялістамі пад № 8, ільнавалакно, прынятае пад № 9, расцэньваецца пад № 13.

Хто вінават у гэтым ашуканстве ільназдатчыкаў? Зразумела, прыёмшчык. Але прыёмшчык, аказваецца, зусім ня вопытны чалавек, нерны год працуе, летась быў пазручным. Вінаваты тут у першую чаргу Полацкая міжраённая кантора загатільну і не заведны Цімкоў, які не забясьпечыў Вушацкі загатпункт вопытным кіраўніцтвам.

Можа няма спэцыялістаў? Ёсьць. Тры вопытныя прыёмшчыкі працуюць у Полацку на міжраённай базе. Адзін з іх мог быць перакінут у Вушачы, а нявопытны вушацкі прыёмшчык мог яшчэ з годзік пазучыцца ў Полацку.

Гэтага ня было зроблена. Вінаватыя павінны адказаць перад партыяй і судам за дапушчаную няўважлівасьць да ацэнкі прадукцыі, якую здаюць калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі.

У гэтым адна з прычын марудлівага ходу ільназагатовак і асабліва нізкай якасьці загатоўленай прадукцыі.

Але нельга толькі гэтым выгумачыць марудны ход ільназагатовак па раёне.

На 22 сьнежня раён выканаў заданьне па ільназагатоўках на 41,9 проц. За 23 сьнежня паступіла 4 тоны. Плян выкананы на 42,8 проц. За дзень прырост — ва 0,9 процэнтаў.

Калі так будзе далей, загатоўкі заляпнуцца яшчэ па два месяцы.

Дзе-ж прычына адставаньня? Галоўная — у непазрыхтаванасьці да перапрацоўкі ільну. Гэтага ня хочуць адкрыта прызнаць у раёне. Высоўваюцца «абэктыўныя» прычыны. Старшыня РВК тав. Лісовіч пры гэтым дадае: «Няма мялак».

У сапраўднасьці ёсьць шмат двухмяльных мялак, прадукцыйнасьць іх 40—50 кгр. у зьмену, значыць можна даваць 100—150 кгр. валакна ў суткі па адной мялцы, калі арганізаваць працу ў дзьве-тры зьмены. А мялак ёсьць 40 ці 50, дакладна ня ведаюць, значыць толькі па гэтых 2-вальных мялках у суткі можна даваць каля 7 тон валакна. Апроч таго, ёсьць прохвальныя і шасьцівальныя мялкі, якія могуць даць яшчэ столькі-ж. Акрамя таго, раён здае трасту.

Значыць па 4, а 24 тоны можа паступаць у дзень на пункты загатільну, г. зн. мінімум 5—6 проц. гадавога заданьня. Такава арытмэтыка перапрацоўкі ільну ў Вушацкім раёне. Гэтага ў раёне добра яшчэ не ўявілі. Асабліва не ўявілі гэтага ў Кузьлацкім сельсавеце, які выканаў плян ільназагатовак па 3,6 проц., у Чарапоўшчанскім сельсавеце — 19 проц., у Сайнскім — 14 проц. Нічым іншым, як кулацкім уплывам, сабатажам, арганізаваным кулакам, нельга гэтага вытлумачыць.

Райпартарганізацыя павінна зрабіць з гэтага належныя вывады і неадкладна ліквідаваць адставаньне ў ільназагатоўках, разбураны кулацкі сабатаж, арганізаваны масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў для далейшага сацыялістычнага наступленьня разгорнутым фронтам.

Л. М.

Чаму Мышкаўскі сельсавет трапіў на чорную дошку

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Перад адкрыцьцём пленуму Мышкаўскага сельсавету (Сіроцінскі раён) у прэсыцыум паступіла заява пасьлядоўнікаў в. Рыжкові. Заява была напісана пазрэбна, але досыць эразумела. Гэта заява лепш за ўсё аказвае на пытаньне, чаму Мышкаўскі с.-с. трапіў на чорную дошку за марудны ход выкананьня загатовак усіх відаў, у тым ліку і ільну.

Вось зьмест гэтай заявы:

«Плян, даны сельсаветам нашай вёсны па загатоўках валакна і насеньня, лічым правільным. Камісіі сацпейнасьці на агульным сходзе ніхто не выбіраў. Член сельсавету (былы) Шацько Пэўла пазваў у камісію тых, на кого ён меў назвею. Гэта камісія разьмяркавала заданьне наступным чынам:

на сваякоў паклала менш усяго, сабе зусім ня вызначыла, акрамя Шацькі, і то яму зусім мала — 20 фунтаў валакна. У дадатак кулачны Латышоваі вызначана 3 пуды ільну (як сваякіні), а сераднякам, якія мяюць зямлі ў два разы менш, дана па два пуды».

Такія зьявішчы ў Мышкаўскім сельсавеце — невыпадковасьць. У в. Барсукі замежнік Прыгун Якуб атрымаў ад сельсавету цьвёрдае заданьне здаць 5 пудоў ільну, а сераднякі Жук і Булак атрымалі па 6 пудоў.

Старшыня сельсавету Харкевіч (як зараз выключан з партыі і аддаецца пад суд з усім складам прэзыдыуму сельсавету) да апошніх дзён пакабна заяўляў прэдстаўнікоў РК, што плян на ільне па ўсіх вёсках у парадку самаабвязацельстваў давершены да ўсіх гаспадарак. На справе-ж гэта злосная хлусьня. У сапраўднасьці пляны вызначаліся самім Харкевічам і яго спадарожнікамі. У выніку бяднацкія і серадняцкія гаспадаркі атрымалі большыя заданьні, чым заможныя і кулакі.

Чаму ж гэтых агентаў кулака ў Мышкаўскай парт'ячэйцы зараз выкрыта, але ня ўсе.

Як адзіны пастунак члена партыі Кібісава (намесьнік старшыні сельсавету), які ў пэўным вытлумачэньні правёў сход у в. Вушыўкі і зьменшыў плян для вёскі па аўсу на 43 пуды. Гэты-ж самы Кібісаў на пікрыкай нарадзе партыйна-савецкага актыву сельсавету заяўляе: «Плянаў па ільну мы ня выканаем».

А вось другі кулацкі абаронца — Скобаў С., кандыдат партыі і сакратар сельсавету. Ён абараніў сваякоў заможнікаў Натахавых (да рэвалюцыі мелі па 25 га зямлі, на 5 кароў і г. д.) ад цьвёрдага заданьня. Ці можа такі кандыдат партыі весьці за сабою калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы? Парт'ячэйка ліберальна адносіцца да кулацкіх агентаў Кібісава і Скобава, пакінуўшы іх у сваіх радах.

У рэзае выпадкаў кулацкаму сабатажу дапамагаюць самі члены сельсавету. Напрыклад, на вучастку члена сельсавету Акулава Антона бяднак Шапцір выканаў заданьне па бульбе, збожжы і ільне, прычым валакна здаў 53 кгр. замест самаабвязацельства ў 50 кгр. А сам член сельсавету Акулаў замест 24 кгр. здаў толькі 9. А прыёмсль Акулава Мосьцьвей заданьне па валакне выканаў на 50 проц. Член сельсавету Бабчанко ў в. Вушыўкі, атрымаўшы хабар ад заможнікаў Жукавых, выкаліў іх ад загатовак, а бяднячка - вдава атрымала заданьне ў 10 пудоў збожжа.

Для паўнаты малюнку трэба яшчэ спыніцца на выкананьні абавязкаў перад дзяржавай калгасным сэктарам Мышкаўскага сельсавету.

Буйнейшы калгас «Перамога» па сваёй удзельнай вазе ў агульным пляне сельсавету займае процэнтную частку і тым ня менш з 13 тон ільнавалакна здана толькі 5. Траста пераапрацоўваецца ў калгасе вельмі марудна, асабліва ў брыгадзе Красікава. Маччымасьці для хутчэйшай пераапрацоўкі ільну не скарыстаны. Лён сушыцца ў 2-х восецях, а іх ёсьць 4, плюс дзьве лазьні, дзе таксама можна наладзіць сушку. У выніку мялка напружана ў суткі ня больш 5 гадзін. 24 сьнежня брыгадзір Красікаў зусім спыніў работу — сабраў кампанію і паехаў на 2-3 дні ў Віцебск «прагуляцца».

*

Зараз Мышкаўскі сельсавет занесен на чорную дошку і знаходзіцца пад дзяржаўным байкотам.

Першыя меры, прынятыя ў адносінах да сабатажнікаў загатовак далі павышэньне тэмпаў — за пяцідзеньку на 14,1 проц.

Б. Харытоньчык.

Мышкаўскі сельсавет, Сіроцінскі раён.

26 сьнежня.

Чорная дошка

Ерэтычнаму загатовак

За злоснае і сыстэматычнае невыкананьне плянаў дзяржаўных загатовак сельгаспрадуктаў, за сабатаж, арганізаваны кулацкімі элемэнтамі, пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

Раёны:

1. Талачынскі, 2. Горацкі, 3. Кармянскі, 4. Дубровенскі, 5. Асьвейскі.

Сельсаветы:

па **Чачэрскім раёне:** Будзішчанскі і Глыбачанскі,

па **Буда-Кашалёўскім:** Нядальскі, Патапаўскі і Губіцкі,

па **Менскім раёне:** Абчацкі, Папярнянскі,

па **Віцебскім:** Старасельскі і Рудакоўскі,

па **Сеньненскім:** Машчонскі і Алексінскі,

па **Дзяржынскім:** в. в. Станкава, Каменка і Шатаноўшчына,

па **Пятрыкоўскім раёне:** Ліпніцкі, Гліненскі і Асавецкі сельсаветы

па **Клімавіцкім раёне:** Красавіцкі сельсавет,

па **Лепельскім раёне:** Ляхаўскі сельсавет і вёскі Бабча, Кругляцы і Стальбцы

па **Чэрыкаўскім раёне:** Каменскі сельсавет,

па **Бягомльскім раёне:** Дамаржыцкі сельсавет.

па **Чавускім раёне:** Праздкоўскі, Рабаўскі і Дзеднаўскі,

па **Пагойскім раёне:** Гайнінскі,

па **Нараўлянскім раёне:** Мухаедаўскі, Хаткоўскі,

па **Чашніцкім раёне:** Ульпянавіцкі,

па **Магілеўскім раёне:** Вышаўскі, Хонаўскі, Рафапаўскі, Гусьпішчанскі,

па **Сіроцінскім:** Зэранаўскі і Маскаўскі,

па **Клічаўскім:** Вільканскі, Грабавецкі, Даўжанскі і Дубінскі,

па **Сураскім:** Камароўскі і Войтаўскі,

па **Аршанскім:** Буеўскі,

па **Пухавіцкім:** Гарэлецкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі.

У гэтых раёнах і сельсаветах неадкладна спыняецца падвоз тавараў і каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль на месцы.

Вывозяцца з каапэрацыйных крам і складаў усе наяўныя прамтавары.

Поўнасьцю забараняецца калгасны гандаль.

Спыняецца ўсякага роду крэдытаваньне і датэрмінова спаганяюцца ўсе выданыя крэдыты і інш. фінансавыя абавязацельствы.

Аб непрадстаўленьні ільназаводамі справаздачнасьці па трасьце

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 27-XII 1932 г.

За сыстэматычнае і злоснае непрадстаўленьне зводак па загатоўках ільнатрасты і за невыкананьне пляну па перапрацоўцы трасты зьнець з работы з перадачай суду дырэктароў ільназаводаў:

1. Гарадоцкага — т. Несьцярэвіча.
2. Шклоўскага — т. Побаян.

Абвясьціць вымову дырэктарам ільназаводаў:

3. Зарубскага (Дубровенскага р.) — тав. Мельцыну.
4. Кармянскага — т. Даньвігу.

Лічачы нездавальняючым кіраўніцтвам з боку нам. начальніка Ільнаканпляводтраста Тараканцэву т. Сарахалетава ільназаводам у галіне арганізацыі вучоту на загатоўках трасты і яе перапрацоўкі, абвясьціць тав. Сарахалетаву вымову.

За адсутнасьць кіраўніцтва ільназаводамі абвясьціць вымову дырэктарам МТС:

1. Гарадоцкай — т. Нікіфарову.
2. Шклоўскай — т. Зелянкоўскому.

Залежы ільнавалакна на пунктах горацкага загатільну

ГОРКІ. (Наш спец. кар.). Горацкі раён па здачы ільнавалакна выканаў заданьне на 45,5 проц. Тэмпы перапрацоўкі ільну зусім незадавальняючыя. Шмат ільну яшчэ не перапрацавана. Гэта ў той час, калі ў раёне ёсьць 519 ільнамялак, у тым ліку 227 трохвальных, 9 шасьцівальных. Але гэтыя ільнамялкі расстаўлены бяз усякага пляну, дзе і як папала. З 219 калгасаў у 85 зусім няма мялак. Яны чакаюць пакуль скончаць перапрацоўку іншыя калгасы. Між тым, мялкі зусім не напружаны і працуюць ў адну зьмену.

Адмоўна адбіваецца на тэмпах ільназагатовак непадрыхтаванасьць апарату Загатільну. Частка прыёмачных пунктаў не забясьпечаны кваліфікаванымі сартыроўшчыкамі. Ня ўсе пункты забясьпечаны інвэнтаром. На Любашынскім і Горыскім пунктах няма прэсаў, а на цэнтральным горацкім пункце іх 4.

За апошні час на пунктах скапілася шмат прадукцыі — 150 тон ільну і 166 тон ільнянога сеяна. Адгрузка ільнавалакна затрымліваецца тым, што горацкі Саюзтрэст не прадастаўляе вагонаў. Між тым, на Лепінскім пункце шмат ільну ляжыць пад адкрытым небам. Адгрузка ільнянога сеяна спынена з-за адсутнасьці мяшкоў, якія павінна была прыслаць віцебская алейня.

Раённыя арганізацыі да апошняга часу загатоўкамі ільну і пянькі вельмі мала цікавіліся. Тут панае «старгоасьць» кампаніі. Калі загатаўлялі бульбу, пра лён зусім забылі. Гэтым карысталіся кулацтва і арганізавалі сабатаж ільназагатовак. У той час, калі раённы плян па ільнавалакну выкананы на 45,5 проц., цьвёрдазаданьне здалі ўсяго 9,3 проц. валакна. Па насеньні плян выкананы на 100 проц., а цьвёрдазаданьне здалі ўсяго 27,5 проц. Нялюк па кулацка-заможным элементы былі зусім слабы.

Каб сарваць ільнавазагатоўкі, кулакі пачалі папярэдзіць чуткі, быццам замест ільну прыймаюць паклю, і на ўсе загатпункты раёну замест ільну пачала паступаць пакля. Атрымаўшы квітанцыі аб здачы паклі, многія ільназдатчыкі сумняваліся і лічылі, што ільнавалакна здаваць ня трэба. А работнікі Загатільну не зразумелі гэтага кулацкага манэўру і нізкай расталмачальнай работы сярод ільназдатчыкаў не вялі.

Толькі ў апошні час раённы камітэт партыі прыняў рад захадаў да фарсаванага загатовак. Загатчык выторгчага вучастку МТС па Каплеўскім сельсавеце Бабылёў, які ня прыняў ніякіх мер да адпрацоўкі і здачы ільну, зьнят з работы і выключан з партыі. За патуранньне кулацкім элементам выключан з партыі старшыня Павяратаўскага сельсавету Шэйнінскі. Але меры гэтыя непастарчальныя. Кулацкі сабатаж яшчэ на злобліе.

Ф.

Кулацкі абаронца выключан з партыі

БЕШАНКОВІЧЫ. У Астроўнянскім сельсавеце сабатаж загатовак кулацтвам узначаліў старшыня сельсавету Сухоцкі. Пад прадлогам «непарушэньня» рэвалюцыйнай законнасьці, ён выступіў супроць націску на кулака.

— Калі захоча кулак здаць збожжа ці лён, дык здасьць, а не захоча, дык і ня здасьць, — казка Сухоцкі.

Мера націску ў Сухоцкага адна — пасылаць кулаку толькі навядамленьні.

І таму кулацка-заможныя гаспадаркі выкананы плян па збожжы на 69,7 проц., па ільну — на 4,7 проц.

Замест барацьбы за збожжа, лён, замест бязьлітаснага адпору кулацкаму сабатажу Сухоцкі стаў на шлях абароны кулацкіх інтарэсаў.

Правасапартуністычная практыка Сухоцкага прывяла да таго, што сельсавет за заставаньне ў выкананьні загатовак занесен на чорную дошку.

Зараз склад сельсавету на чале з кулацкім расшыпіваю і прыкрасьцем Сухоцкім распушчан. Сухоцкі пастановай РК КП(б)Б з партыі выключан. Ён павінен быць прыцягнуты таксама і да судовай адказнасьці.

Дыболь.

Тэмпы збожжазагатовак усё яшчэ не забяспечваюць выканаўня пляну у вызначаны тэрмін

Здаваць ня менш 3.000 тон у дзень.—Толькі сапраўды ударнай баявой работай мы даб'ёмся завяршэньня збожжазагатовак да 1 студзеня

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За ўзорныя тэмпы барацьбы за збожжа, за мабілізацыю мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на ліквідацыю кулацкага сабатажу заносім на чырвоную дошку наступныя раёны:

1. **Тураўскі раён**—выканаў 106,1 проц. гадавога пляну,
2. **Жыткавіцкі раён**—выканаў 105,7 проц. заданьня,
3. **Вузьдзенскі раён**—101,8 проц. пляну,
4. **Камарынскі раён**—101,6 проц. заданьня,
5. **Слуцкі раён**—выканаў 100,1 проц. пляну,
6. **Менскі раён**—выканаў 100,1 проц. заданьня.
7. **Ельскі раён**, які выканаў 100,3 проц. гадавога пляну,
8. **Лельчыцкі раён**--выканаў 100,5 проц. заданьня

Дадаткова заносяцца на чырвоную дошку

9. **Стара-Дарожскі раён**—выканаў 101,5 проц. гадавога пляну
10. **Смалявіцкі раён**—100 проц. гадавога заданьня па збожжы

РАЗЬБІЦЬ КУЛАЦКАЕ ГНЯЗДО

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Капаньскі сельсавет знаходзіцца на невялікай адлегласьці ад Рэчыцы, але дарога да яго ідзе праз балоты, праехаць незаўсёды лёгка. Дрэнная дарога, так сказаць, і паслужыла «аб'ектыўнай» прычынай таго, што ў Капань мала хто езьдзіць, Капаньскаму сельсавету не аддаюць патрэбнай увагі, дрэнна кіруюць ім.

Нядзвальнаючая работа сельсавету, безадказнасьць, упаўнаважанага, дрэнная кіраўніцва работу ажулася з асаблівай сілай зараз, у момант напружанай загатоўчай работы.

Рэчыцкі райком КП(б)Б абвясьціў штурм. Зразумела, гэта датычыць і Капаньскага сельсавету. Але праходзіць дзень, два, тры, праходзіць першая пяцідзёўка, канчаецца другая і ў зводках паказваецца адно — 27 проц. і ня больш.

Дойдзе, але Рэчыцкі райком да апошнята часу не пацікавіўся, чым тлумачыцца гэта сваўкупная ўстойлівасьць процанту.

І толькі калі справа дайшла да разьбіцьця, адкрытага сабатажу, да арганізаваных кулацкіх выступленьняў, толькі тады райком стварыў камісію на чале з сакратаром тав. Гершманам. Камісія мела магчымасьць пазнаёміцца з шкодамі апартуністкай, кулацкай дзейнасьці сельсавету і, зразумела, з шкодамі жасьці свайго раённага кіраўніцтва.

Частка сялян вёскі Капань адмовілася выконваць свае абавязацельствы перад дзяржавай па здачы збожжа адмовілася плаціць сельска-гаспадарчы падатак.

Але перш чым растлумачаць, што гэта за «частка сялян», перш чым даваць апалёг прычынам адмаўленьня, зьвернемся да кіраўніцкай сельсавету і яго актывістаў. Іх характарыстыка сама па сабе ўжо растлумачвае сутнасьць справы.

Намесьнік старшыні сельсавету Равенкаў, заможнік, выкруціўся ад падатку, «забыўшы» ўнесьці абавязацельства па здачы збожжа, усяляк падтрымлівае кулацкія дзеяньні.

— Збожжазагатоўкі ў нас, — кажа Равенкаў, — шуць кропка, бо не ўраджыла, сельсавет нішога ня можа зрабіць. Кулакоў і заможнікаў у нас няма, мы ўсе роўныя.

Кулацкія элементы, абаўтрэтыя пільні слоўцы свайго вожнага служкі Равенкава, шукаюць хітра, з поўнымі манэўрамі арганізаваць сабатаж загатовак усёй вёскай. Прыдумаўшы агульнае заданьне, кулакі, не без дапамогі Равенкіх, паставілі справу так, што па сходзе разьвярталі ўсім порадку.

Кулакі і заможнікі — Маеўскі Гаўрыла, Маеўскі Раман Залатухін Мажэй і іншыя, якія і складаюць тую самую «часку сялян», пазіцыі былі здаць столькі, колькі і бядняцка Канавалава Салоха.

Адзіаасобнікі—беднякі з поўнай падставай патрабавалі ліквідацыі ўраўніловкі. Кулацкія элементы справавалі выкарыстаць гэта для таго, каб арганізаваць, так сказаць, «адзіны фронт» сабатажу заданьняў дзяржавы.

А сельсавет? Ён акружыў сябе «актывістамі» тыпу кулака Дуброўскага, вусамі Равенкавых прапаведваў класавы мір і безаварыў бедняцкую пагарыцца з кулакамі, а кулакоў з беднякамі. Дуброўскі і да яго падобныя зьявіліся выгадным інструментамі ў квартэце кулацкага сабатажу.

Казыраючы званьнем «партызана», кулак на сапыльным становішчы і ізаляцыі Дуброўскі з адкрытым забралі наступае ў абарону кулакоў, супроць мерапрыемстваў улады. Ён на чуваецца дамогці. І нават больш таго, Дуброўскі адзін час быў арганізатарам калгасу. Але калі прыйшла справа да абагульваньня жывёлы (з ў яго 4 каровы, пара коняй), ён павярнуў назад.

Кулацка - заможных гаспадарак, пакінуў Дуброўскага, можна налічыць па сельсавету больш дзесятка. Такія гаспадарка, як Зёнкава Сьцяпана, Малаўчыка Гаўрылы, Маеўскага Рамана, Залатухіна Максіма, Усьцянкова Івана, Быкоўскага Сямёна, Яблонскага Васіля (толькі з вёскі Гранаўка) нават пры міласьківасьці Равенкавых былі абкладзены падаткам у разьмеры ад 170 да 250 руб. Ня сюдзячы на гэта ні адна гаспадарка ў сельсавеце не атрымала цьвёрдага заданьня.

Усе яны бесспрэчна павінны атрымаць цьвёрдыя заданьні. Трэба разьбіць гэта кулацкае гняздо. Але перш за ўсё патрэбна ачысьціць сельсавет, яго пранікнуты ад кулацкіх элементаў, пасадзіць Равенкавых на лаву падсудных. Сельсавет — орган пралетарскай дыктатуры, і ўсякія інтэнцыі выкарыстаць яго ў карэсных кулацкіх мэтах пазнаны каранцца са ўсёй суровасьцю рэвалюцыйных законаў.

Трэба дастасаваць поўнасьцю наш закон і да кулацкіх прапаведнікаў і практыкаў тыпу Дуброўскага, якія сошлуюць свае крывакорныя клыкі прыкрыць партызанскім білетам.

Сабатаж, арганізаваны кулакамі вёскі Гранаўка, павінен паслужыць сур'ёзным палітычным урокам для Рэчыцкага райкому КП(б)Б. Мала зрабіць арганізацыйныя вывады. Кулацкі сабатаж будзе канчатова зломлен, посьпех загатовак будзе забяспечан толькі тады, калі партыйная ячэйка і сельсавет у сваёй рабоце будуць апірацца на моцны калгасны актыў, на актыў адзіных савецкай улады працоўных адзіаасобнікаў.

Гэта яшчэ і яшчэ раз прыходзіцца паспрыяць таму, што ў Рэчыцкім раёне ёсьць рэцыдывы «левацкай» работы мінулага кіраўніцтва, таму, што зараз у Капані сельсавет груба ігнараваў, абыходзіў перадавы актыў калгасьнікаў—прадпоўных адзіаасобнікаў.

Дашкевіч.

Пасьля занясеньня на чорную дошку

ГОРКІ. (Наш спец. кар.). На 27 сьнежня галавы плян збожжазагатовак па Горацкім раёне выканан толькі на 68,2 проц. За апошнюю пяцідзёўку прырост нездавальняючы — ня больш 2—3 проц. у дзень.

За 5 дзён (з 15 па 20 сьнежня) па Горацкім, Дрыбінскім і Жданавіцкім сельсаветах не паступіла ні аднаго кілограму збожжа. Шарынскі сельсавет выканаў гадавое заданьне толькі на 25 проц., Кіраўніцтва гэтых сельсаветаў зраслося з заможнымі элементамі і разам з імі сабатавала загатоўкі.

Вельмі дрэнна працуюць прыёмачныя пункты. Здатчыкам збожжа прыходзіцца чакаць у чарзе на 10—12 гадзін. Кантора Загатозбожжа не пакланадзілася нават арганізаваць чайную пры прыёмачным пункце.

Загатоўчыя арганізацыі не аддаюць пякай увагі здачы збожжа па асобных культурах. Па пункты паступае, галоўным чынам, авёс і ячмень і вельмі мала жыта і пшаніцы.

Кантора Загатозбожжа не складае зводак аб загатоўках па асобных культурах

Наогул улік загатовак у раёне вельмі дрэнны. Так, паводле зводкі на 20 лістапада, Гаспадарскі сельсавет выканаў 44,3 проц. пляну, а паводле даных на 20 сьнежня — 43,6 проц. На Асталопаўскім сельсавеце было здана ў лістападзе 71 проц., а зараз 62 проц. Такі, з дазволу сказаць, «улік» толькі дэзарыентуе раённыя арганізацыі, не дае ім магчымасьці апэрацыйна кіраваць загатоўкамі.

Праўленьне камуны «Беларусь», на чале са сваім старшынёй Бурэжковым, разбазарыла 22,5 тоны збожжа. Гэта справа знаходзіцца ў раённага пракурора, але дагэтуль не разгледжана і Буранкоў застаецца непакараным.

Старшыня камуны «Чырвоная зара» Майсеёў разбазарыў 58,7 тон збожжа. Справа перадана ў суд, яшчэ 25 жніўня, але дагэтуль лежыць пад сукнам у парсудзьдзі Лаўрыновіча.

Саўгас імя Ленина разбазарыў 28 тон пасяльнага збору. Справа з 9 верасьня знаходзіцца ў раённага пракурора Дымшаца. За гэты час дырэктар саўгасу пасьпеў перакачаваць на пасаду старэйшага агранома ў райземаддзеле, вышаўшы сухім з вады.

Як вядома, СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесьлі Горацкі раён на чорную дошку і ўжылі да яго рад эканамічных мер спагнаньня. Толькі пасьля занясеньня раёну на чорную дошку мясцовае кіраўніцтва мабілізавала парт. і праф. актыў і паслала яго па вёску, толькі зараз кіраўнікі раённых устаноў выехалі ў сельсавет. Але гандаль на рабе ня спынен. У Горках калгасьнікі і адзіаасобнікі свабодна гандлююць сваімі прадуктамі, а міліцыя на прымае ніякіх мер да ажыцьцяўленьня дырэктыў вышэйшых органаў.

А. ФЕДАСЦОЎ.

Абавязацельства засталося пустой дэкляраваньнем

ДЗЯРЖЫНСК. (Наш. спецкар.). У свой час кіраўніцтва ДЗЯРЖЫНСКАГА раёну ўзяло на сябе абавязацельства «апярэдзіць XV гадавіну Кастрычніка першымі на збожжазагатоўчым фронце». Адмоў гэта абавязацельства ня выканана і па сёньняшні дзень. На 27 сьнежня процант выкананьня пляну разам з насеннай складае ўсяго 78,1.

Такім чынам, абавязацельства засталося пустой дэкляраваньнем.

— Нічога падобнага, мы абавязаліся выканаць плян без насеннай пазыкі,—ухіляецца «напрасвечку» кіраўнікі райкому і райвыканкому.

Цікава, можна з нацэнкай прыняць «адпрэўку» пад увагу. Але ад гэтага справа нікольні ня зьменіцца. Па-першае, плян загатовак і без насеннай пазыкі ня выкананы, па-другое, пры цяперашнім «абавязацельстве», па якому збор насеннай пазыкі ня пікуе абавязковым.

Ня ўжо працаўны ачышчэй збожжазагатоўчай кампаніі ў раёне? Іх вольна многа. Але асноўная—гэта зусім слабы адпор кулацкаму сабатажу з боку партыйных ячэек і сельсаветаў, а ў некаторых выпадках простае патурэньне кулацкаму ворагу. Вось факты, калі кулакі і заможнікі ня толькі самі ўхіляюцца ад прадпісаньня дзяржаўных органаў, але і падуць ініцыятыўнасьць ад выкананьня дзяржаўных заданьня

Збожжаз гатоўкі

У абдымках клясавага ворага

Агляд лістоў рабселькораў

Сацыяльнае падпор'е. Пустынная вясковая вулка раптам напоўнілася гулам царкоўнага звону, які прыносіла з сабой чвяцаў. Адзінкамі і групамі падвінуліся сяляне да царкоўнай агароды.

А стары звонар бесперашкодна цягнуў за вяроўкі... Зьявіліся рэлігійныя пратэсты. Пра гэсія на чале з попам, апрануты ў сьвяточна залатую рызу, пайшла па тысячнай вуліцы выкрыкваць... спэцыяльнае заданьне.

Вось што пішна нам т. П—4.

«У в. Мільчаны, Гомельскага раёну, абгнаеныя кулакі на чале з мясцовым попам арганізавалі рэлігійную дэманстрацыю, накіраваную супроць збожжазагатовак. Удзель нікі рэлігійнай працэсіі зьбіралі збожжа ў непадсьпены царкоўны фонд».

Пад відам мірнай рэлігійнай працэсіі працавалі «дадатная кулацкая брыгада», якая праводзіла антысавецкую агітацыю сярод бяднацка-серадняцкіх мас па выдачу збожжа дзяржаве.

А дзе былі мясцовыя ўлады, партыйная і камсамольская ячэйкі? Нуўжо яны аб гэтым нічога?

«Члены ячэйкі на чале з сакратаром Сакам, былі заняты... п'янствам, а сельсавет пад старшынствам Баранава захварэў клясавай сьлепатой».

На запрос сельсавету кулакі і заможнікі свабодна агітавалі супроць збожжазагатовак, а яму хоць-бы што... Свае людзі, яякай пагуляюць...

Дзіўна тое, што пра кіраўніцтва Мільчанскага сельсавету ўжо дзесяткі раз пісалі ў газэту, а гомельскія арганізацыі ні адным словам не адгукаюцца. Як відаць, ім ня хочацца пакідаць «аўтарытэт» мільчанскіх кіраўнікоў.

У кулацкіх шалоне аказаліся і члены Рагінскага сельсавету, Буда-Кашалёўскага раёну.

«Старшыня Рагінскага сельсавету ДЗЬМІТРЫЧЭНКА — член партыі — страціў свой партыйны твар і перайшоў на бок клясавага ворага. Цьвёрдыя заданьні па сельсавеце спаганны толькі на 14 проц.». (Н. К—а).

Наводзіт зваротну увагу пасяджальні Дзьмітрычэнка прыгрымізавацца асобнай думкі: «Каб я быў старшынёю калгасу, дык у першую чаргу сеяў-бы насенфонды і на версе пасьпяў бы поцелам, каб ня бачылі».

«Мужную» пораду даў старшыня сельсавету калгасам. Яны так і зрабілі:

«Ні адзін калгас па сельсавету не вярнуў ні аднаго кілёграму збожжа».

У кіраўніцтва сельсавету пралезьлі кулацкія элементы, якія зьлосна сабатуюць адачу збожжа.

«Нам. старшыні, член прэзыдыуму сельсавету МІКОЛА НАВАКОЎСКІ — моцны серадняк, павінен здаць 10 пудоў збожжа, ня здаў ні аднаго фунта. Ня выканалі сваіх заданьняў члены сельсавету Царыкаў, Зайцаў і інш.».

Ці мала такое кіраўніцтва забясьпечыць своечасовае выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній? Зразумела, не. Плян збожжазагатовак выкананы па сельсавету ня ці [illegible] на буйабе. — на 70 проц.

Рагінскі сельсавет павінен быць ачышчан ад клясава-варожых элементаў.

Аб такім-жа абалоцку ў сельсаветах Дубровенскага раёну паведамляе нам селькор «Стракаты».

«У кіраўніцтва Верацейскага сельсавету пралезьлі кулацкія элементы, якія праводзяць там сваю палітыку. Старшыня сельсавету БРАЦІШКА — выхадзец з заможнай сям'і. Сакратар БАЛТУНОЎ да раванцыі моў 35 га зямлі, а дзепавод — АНТОСЬ ГІКАС — 59 га. У 1931 г. Гікас быў раскулачан і выселен за межы БССР. Праз год ён зноў зьявіўся ў Верэйцах і зняў пасаду ў сельсавеце».

Чым займаліся гэта «кіраўніцтва». Той-жа селькор піша нам, што кандыдат партыі Брацішка, разам з Балтуновым і Гікасам, пры актыўным удзеле старшыні калгасу «XII Кастрычніка» Шамкова (заможнік, які быў асуджаны ў 1927 г. на тры гады за пазыку [illegible]), займаецца сыстэматычнай п'янкай сумесна з кулакамі. Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам па посеву. З заможніка Архіпа Дадыкіна цьвёрдае заданьне было зьнята і яму адвялі 1 га сялібы ад калгаснай зямлі.

Паблізкі кулаком робіцца ку дарча.

«Брацішка і Балтуноў вельмі часта атрымліваюць ад кулакоў за сваю ўдзячную работу падарункі (масла, мёд, хлеб)».

Яны падышлі да таго, што

«Стварыты спэцыяльны фонд збожжа, у які кожны калгас павінен уносіць пэўную норму. Гэта збожжа разьмяркоўвалася нелегальным парадкам паміж работнікамі сельсавету».

Доўгі час адчуваала гэта антысавецкая група, а РВК не зацікавіў ае дзейнасьці.

Як сельсавет выконвае загатоўкі? З 10 катрычніка ня 25 лістапада загатоўкі былі на мёртвым пункце, ня зрушыліся ні на адзін крок уперад.

Цікава, што, ня гледзячы на пастанову раённу аб зьняцьці з работы старшыні і сакратара сельсавету, яны дагэтуль камандуюць у Верайцах.

Характэрныя факты паведамляе нам селькор «Зорка» з Пятрыкоўскага раёну.

«Старшыня Піцікага сельсавету, Пятрыкоўскага раёну, АНТАНІШЫН і сакратар парт'ячэйкі ХІЛКО сыстэматычна зьнішчалі цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам. Цьвёрдазаданьнік Гайчук, напрыклад, у мінулым годзе здаў 65 пудоў збожжа, а ў гэтым толькі 1. Сем цьвёрдазаданьнікаў зусім зьнікілі са сьпісаў сельсавету».

Няма нічога дзіўнага ў тым, што Піцікі сельсавет — на апошнім месцы на загатоўках у раёне: па збожжы выканана 41 проц. пляну па мясе — 8 проц. Кулацкая практыка кіраўніцтва сельсавету прывяла да таго, што

«... ў калгасе «Новае сяліцко» разбазаравацца маемасьць. Праўленьне калгасу прадавала кулакам абагуленых кароў. Нядаўна забілі племянную сьвіньню і падзялілі паміж сабой».

Дзе быў дагэтуль Пятрыкоўскі РВК? Чаму ён не праявіў патрэбнай клясавай пільнасьці? Ён, як мы бачым, праявіў ліберальныя адносіны да мацаваньня клясава-варожых элементаў. Трэба тэрмінова вадараваць кіраўніцтва Піцікага сельсавету.

У Талачынскім раёне, знесеным на чорную дошку, ёсьць Волжаўскі сельсавет, а ў ім в. Пляшчыўцы. Яна гнобіна адстае па ўсіх відах загатовак. Плян па збожжы выкананы на 15 проц. А прычына зрыву дзяржаўнага заданьня простая:

«У склад камісіі садзейнасьці прабраліся былы непадзяньнік петраградзкай турмы ШУШКОЎ, падкулачнік МЯСЬНІКОЎ МІКОЛА і кулацкі агент, настаўнік ЦЕРАХОВІЧ, сваякі якога высланы за антысавецкую дзейнасьць за межы БССР». (Н-я).

Вось гэта «цёплая кампанія» ўзначаліла сабатаж кулакамі цьвёрдых заданьняў і прыняла да зрыву загатовак. Яе месца, зразумела, не ў камісіі садзейнасьці, а на лаўцы падсудных.

У гэтым жа Талачынскім раёне старшыня Слабенскага сельсавету Сідзельцаў, аб аднымі савецкай дзейнасьці якога «Зьвязда» паведамляла ўжо, —

«... выконваючы патрабаваньні мас, даў цьвёрдыя заданьні кулаком і заможнікам, а ўцішну пораду ім разбазарыць гаспадарку. Кулакі з благаслаўленьня сельсавету распрадалі ўсю сваю жывёлу і збожжа. Калі засталіся пустыя сьвірны і хлявы, Сідзельцаў зьявіўся зрабіць вобыск і, зразумела, нічога не знайшоў. Ён-жа выдаў дакумэнты, як беднаку, купаку Латушкіну Ільні і пораў яму ад'ехаць як мага хутчэй з вёскі». (Н. Л—н.).

Вось яшчэ адзін факт:

«Член Асавецкага сельсавету, Любаньскага раёну, з в. Зяленкі, Найгаряна Ян выказае хабар у сялян, кажучы: «пачастуй чым-небудзь, тады зможаш не здаваць». (АЛЕСЬ ШЛАКОЎСКІ).

Плян збожжазагатовак па гэтай вёсцы выкананы мекіні, чым на палову. Сельсавет вельмі аб злачынай дзейнасьці Найгаряна, але ніякіх мер ня прымае.

«У ЯГОНАЎСКІМ сельсавеце, Шыпоўскага раёну, старшыня сэкцыі РСІ пры сельсавеце ГАГОШКІН, старшыня камітэту узаемадапамогі Новікаў Кірыл, замест работы па загатоўках, распрадзюць камітэцкае збожжа. За кароткі час яны разбазарылі зьыш 1.000 пудоў» (Селькор «ВЕДАЮЧЫ»).

Усе гэтыя факты галопуць аб неабходнасьці самай бязьлітаснай непахібнай барацьбы з клясава-варожымі элементамі і кулацкай агітурай, аб неабходнасьці рапучага адпору мілым ліберальным адносінам да клясавага ворага.

Т. Б.

Лицейны цэх заг. Рэтсельмаш (Лейпцыгны Каўказ).

Моцныя кадры—Белдрэс

(Ад нашага спец. кар.)

Белдрэс. 19 сьнежня, пасьля вынрабаваньня гадрацэнтрала цэху, адзначаныя клцёі ядан у вытворчасьці, але ня гледзячы на гэта, станавіча станцыі застаецца нерухомымі. Электрастанцыя шчэ нядзельна забясьпечвае спажыўцоў патрэбнай колькасьцю электраэнэргіі.

Абяцьня, як чакаў, стаіць вестра пытаньне аб забясьпячэньні Белдрэс нафтай і дровамі. Нафты электрастанцыя зусім ня мае, дроў хопіць на якіх-небудзь паўтара-два тыдні. Апалавы камітэт пры СНК БССР ужо прыняць самыя рашучыя меры на неадкладны забясьпячэньні Белдрэс апалам.

Вялікія перабоі мае станцыя і з-за адсутнасьці запасных кацельных частак. Заводам «Комінтэрн» (Віцебск) і «Чырвоны жэрнар» (Ворша) даны тэрміновыя заказы выраблць чарвячныя шасьцёрні, але гэтыя заказы яшчэ ня выкананы. Завод «Комінтэрн» марыпуе тэрмінам выраб упорных калец і цапфі, тэрмін выкананьня якіх ужо даўно прайшоў.

Пельга прайсьці міма безадказных адносін да выкананьня сваіх абавязкаў з боку аддзелу снабжэньня Белдрэс. Замест таго, каб сачыць за своячасовым выкананьнем даных заказаў, ён нават ня ведае, якому яны заводу перададзены для выкананьня. На заводзе «Комінтэрн» знаходзіцца каля 2.000 гатовых дыскавых каласьнікоў—тэрмінова заказ Белдрэс—але аддзел снабжэньня і ня думае іх атрымаць. Работа аддзелу настаўлена зусім дрэнна. Людзі закапаліся ў шмат ліх паперах, а жывой апэрацыйнай работы няма.

Асабліва трэба падкрэсьліць недапушчальнае скарыстаньне тэхнічнага персаналу. Электратэхнік Васіньева, якая скончыла маскоўскі энэргатэхнікум, на працягу 13 дзён знаходзіцца на Белдрэс абсалютна бяз усякай работы, бо кіраўніцтва Белдрэс усё «выратае» і ніяк ня можа выранець, якую пасаду ёй прадаставіць. З гэтай-жа прычыны ўжо 20 дзён гуляе бяз працы другі тэхнік тав. Аверчанка.

Белдрэс патрабуе хуткай дапамогі з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР. Для абслугоўваньня топак трэба неадкладна накіраваць у Белдрэс 17 чалавек прабойшчыкаў-шуравіцыкаў. Белэнэрго павінен перакінуць у Белдрэс мінімум трох чалавек у якасьці дзяжурных інжынэраў-цэплатэхнікаў, адсутнасьць якіх аслабляе кантроль работы кацельнага адзяленьня. Белэнэрго так сама павінен пастаўць пытаньне перад Галоўэнэрго (Масква) аб дасыльцы на Белдрэс чацьвертага рэзэрвовага катла, без якога ні ў якім разе станцыя ня зможа бесьперабойна працаваць.

Забясьпячэньне электрастанцыі моцным кадрам аснўных работнікаў (начальнік транспартнага аддзелу, загадчык аддзелу снабжэньня, галоўны бухгальтар і інш.)—баявая задача арганізацыі раёну, асабліва тых, якія зьяўляюцца пастаяннымі спажыўцамі Белдрэс.

Арн Зарубежны.

***

БЕЛДРЭС. Станцыя шчыльна падыходзіць да нармальнай работы. Нагрузка станцыі складае 12 тыс. кілёват. Нармальная нагрузка — 13 тысяч.

Арк. Зарубежны

А. Енукідзэ

Дзесяцігодзьдзе Саюзу ССР

У 1922 г. 30 сьнежня быў падпісан дагавор і палітычная дэкларацыя аб стварэньні Саюзу ССР. Сутнасьць гэтых актаў заключаецца ў тым, што народы савецкіх рэспублік, якія стварыліся пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі, выказалі волю да аб'яднаньня сваіх сродкаў і сіл для абароны рэвалюцыйных заваёваньняў, пастанавілі стварыць адзіную пралетарскую дзяржаву — Саюз ССР на аснове добраахвотнага і роўнапраўнага ўваходу ў склад Саюзу савецкіх сацыялістычных рэспублік.

Асноўны сэнс палітычнай дэкларацыі аб стварэньні Саюзу заходзіцца, такім чынам, да таго, што ў Саюз ССР адкрыт доступ усім сацыялістычным савецкім рэспублікам як існуючым, так і маючым узьнікнуць у будучым, што за кожнай рэспублікай забясьпечваецца права свабоднага выхаду з Саюзу і што ў Саюзе ССР забясьпечваецца нацыянальная свабода і поўнае роўнапраўе ўсіх нацыянальнасьцяй і этнаграфічных груп народаў.

Дзесяцігадовае разьвіцьцё і ўмацаваньне Саюзу ССР і адначасовае разьвіцьцё і ўмацаваньне нацыянальных дзяржаўных стварэньняў — саюзных і аўтаномных рэспублік, аўтаномных абласьцей, нацыянальных акруг, раёнаў і сельскіх саветаў — зьяўляецца лепшым пацьвярджэньнем указаньняў тав. Сталіна, што «нацыянальнае пытаньне можа быць вырашана толькі ў сувязі і на грунце пралетарскай рэвалюцыі».

У той час, як у краінах капіталу, у сувязі з абвастраньнем і паглыбленьнем крызісу, эканомічна слабыя і культурна адсталыя народы ўсё больш падвергаюць абраблённю, прыгнечаньню і гвалтоўнай асыміляцыі, у Саюзе ССР, дзякуючы брацкай дапамозе з боку эканомічна і культурна развітых нацый адкрыцьцё былых калёній і паўкалёній царскай Расіі, шпарка ідзе на толькі ліквідацыя іх адставаньня, але і з кожным годам усё больш падвядуць і ўмацоўваюцца нацыянальныя дзяржаўныя стварэньні.

Усім вядома, што пад час стварэньня Саюзу ССР быў усяго 4 саюзныя рэспублікі — РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР. За мінулыя 10 год у Саюз уступілі яшчэ тры рэспублікі — Узбэкская, Туркменская і Таджыкская, узьнікшыя адпаведна волі народаў былой Туркестанскай аўтаномнай савецкай сацыялістычнай рэспублікі. Былыя народныя рэспублікі — Бухарская і Харэзмская — устаналіў у сябе за гэтыя гады савецкі сацыялістычны лад і ўключыліся ў сацыялістычную сыстэму рэспублік Сярэдняй Азіі. У сучасны момант праз 10 год напалічвалася ня толькі колькасьць саюзных рэспублік, якія ўвайшлі ў Саюз ССР, але за гэты час павялічвалася колькасьць аўтаномных рэспублік і аўтаномных абласьцей. Як аўтаномных рэспублік у сучасны момант сярэдзе 19, аўтаномных абласьцей — 17. Апрача таго за гэтыя 10 год мы арганізавалі 10 нацыянальных акруг, 250 нацыянальных раёнаў і 5.300 нацыянальных сельсаветаў.

Стварэньне нацыянальных дзяржаўных адзінак у сацыялістычнай сыстэме адбываецца пры поўным падрымцы і матэрыяльнай дапамозе, якая аказваецца слабым нацыям з боку нацый больш моцных, у той час, як у краінах капіталу назазваленьне і ограбленьне слабых нацый з боку моцных усё больш узмацняецца. Ограбленьне калёніяльных і паўкалёніяльных народаў, якое робіцца і зараз імпэрыялістычнымі дзяржавамі, служыць пасьлядоўным пацьвярджэньнем таго, што і пасьля дзесяці год заваёўцы верхай акалічнасьць, якая адзначана дэкларацыяй аб стварэньні Саюзу ССР, што «там, у лягеры капіталізму — нацыянальная варожасьць і нераўнасьць, калёніяльнае рабства і шавінізм, нацыянальнае прыгнечаньне і пагромы, імпэрыялістычныя зьверствы і войны».

Дзесяць год таму назад у той-жа дэкларацыі аб стварэньні Саюзу ССР адзначана, што «тут — у лягеры сацыялізму — узаемнае даверэ і мір, нацыянальная свабода і роўнасьць, мірнае сужыцьцё і брацкае супрацоўніцтва народаў». Ніхто ня можа адмаўляць існуючыя факты брацтва і супрацоўніцтва ўсіх народаў СССР і таго, што на аснове нацыянальнай свабоды і нацыянальнай роўнасьці «мы маем справу з працэсам умацаваньня дзяржаўных сувязей паміж незалежнымі рэспублікамі з працэсам, які вядзе да ўсё больш цеснага зьліваньня незалежных нацыянальнасьцяй у адну незалежную дзяржаву» (І. Сталін).

Вялізарны гаспадарчы ўздым і вялікі культурны рост усіх саюзных рэспублік мог быць забясьпечаны толькі пры ўмове аб'яднаньня ўсіх іх намаганьняў і матэрыяльных рэсурсаў у адной саюзнай дзяржаве. Дзесяцігадовы вопыт нашай работы і посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва з усёй бясспрэчнасьцю пацьвярджаюць правільнасьць лініі нашай партыі, якая ўмела курс на стварэньне саюзнай дзяржавы і ператварэньне яе з аграрнай у індустрыяльную, курс на ліквідацыю эканамічнай і тэхнічнай залежнасьці Саюзу ССР ад капіталістычных краін. Ідучы па гэтым шляху ўзьніку цяжкай індустрыі і разгортваньня вытворства сродкаў вытворчасьці, мы стварылі ўласную базу сацыялістычнай буйной машыннай індустрыі, якая зьяўляецца такоюма базай для заняпрыняньня рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Дзякуючы вялікаму росту цяжкай індустрыі мы дабіліся такіх вялікіх посьпехаў у разьвіцьці лёгкай індустрыі і што асабліва важна дзякуючы вялікім посьпехам у разьвіцьці цяжкай сацыялістычнай індустрыі адбыўся рашучы зварот бяднацка-серадняцкіх мас сялянства да буйных сацыялістычных форм сельскай гаспадаркі — калгасаў і саўгасаў. І Савецкі саюз нетаўрыўся з краіны дробнага і найдабрэйшага зямляробства ў краіну самага буйнога зямляробства. Прычым на аснове суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кулацтва як кляса.

Калі прыпомнім, з якімі рэсурсамі мы стварэлі саюзную дзяржаву, і параўнаем з тым, што дасягнулі за мінулыя 10 год, дык у сьвятле гэтых параўнаньняў нашы дасягненьні набываюць выключна вялізарныя размеры. Калі мы пачалі абудоўваць нашу прамысловасьць, дык валавая прадукцыя яе ў 1922 г. складала 22 проц. даваеннай, а ў 1932 г. валавая прадукцыя складае больш 300 проц. у адносінах да даваеннай, прычым па цяжкай прамысловасьці (гр. «А») валавая прадукцыя набліжаецца да 400 проц. даваеннага ўзроўню.

10 год таму назад зруйнаваная імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнамі сельская гаспадарка, якая толькі пачала адпаўзіцца, была ніжэй даваеннага ўзроўню, і пасеўная плошча яе складала 60 проц. даваеннай. У цяперашні час пасеўная плошча складае 135 млн. гэкт. і перавысіла даваенную на 30 млн. гэкт., прычым адбылася карэнная якасная зьмена ў сельскай гаспадарцы, у якой сацыялістычныя формы — саўгасы і калгасы — займаюць пануючае становішча.

Гэтых вялізарных посьпехаў працоўныя СССР дабіліся дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным, перамагаючы вялікія труднасьці і супраціўленьне клясавых ворагаў. Дасягнутыя посьпехі і ў сацыялістычным будаўніцтве за мінулае дзесяцігодзьдзе і ўмацаваньне брацкага супрацоўніцтва народаў СССР забясьпечыць нам магчымасьць яшчэ больш высокіх тэмпаў будаўніцтва і хутчэйшае зьнішчэньне непадпаўкаў і труднасьцяй, якія ў нас ёсьць.

Несакрушальная воля рабочай клясы і ўсіх працоўных нашай краіны, якія выкапалі ў аснаўным ніцігоду за чатыры гады — змагацца за новыя посьпехі — зьяўляецца лепшай гарантыяй таго, што ўжо ў бліжэйшы час, перамогчы труднасьці, мы дабіемся яшчэ большых посьпехаў у будаўніцтве сацыялістычнага грамадзтва.

Дата, штамп і подпіс

Уявіце сябе на месцы Ляшко, вы бувеце адчуваць сябе ня вельмі прыемна: сядзець у інспэкцыі працы і бяз працы. Сядзець і ўвесь час думаць, думаць і ўвесь час сядзець...

Сумна і нудна. Паняволі, калі ні-калі даводзіцца тое-сёе прыдумаць, папрактыкаваць ца, разьвесяліцца:

«Загадчыку барысаўскага кіно-тэатру «Чырвоная зорка».

Згодна законадаўства аб накіраваньні на працу інвалідаў, Інспэкцыя працы прапануе вам накіраваць тав. Васільева ў інспэкцыю для перакідкі яго ў пажарную каманду а на яго месца прымаючыць інвалідку тав. Капавалаву».

Дата — 1 верасьня 1932 г.

Штамп—Барысаўская Інспэкцыя працы.

Подпіс—загадчык сэктару кадраў Ляшко.

Тав. Бэндзідорф—загадчык кіно «Чырвоная Зорка»—прачытаўшы паперку ад Інспэкцыі працы, спакойна пазяхнуў зрабіць так, як напісана.

Але не пасьпеў ён яшчэ пазяхнуць і разьлічыць Васільева, як ужо на заўтра—2 верасьня, з тым-жа штампам, з тым-жа подпісам і на той-жа адрас дасылаецца другая паперка:

«Згодна прадстаўленых дакумэнтаў ад урача тав. Васільевым аб стаўленьні яго аздароўя, Інспэкцыя працы прапануе вам пакінуць яго на старым месцы работы, а тав. Капавалаву накіраваць у Інспэкцыю працы».

Усё?

— Не ня ўсё!

Дзён нацэдзе ня мала, а значыць і пэрспэктыў у практыкаваньнях Ляшко таксама ня мекіш.

3-га верасьня скромны архіў загадчыка кіно-тэатру ўзбагаціўся новым творам:

«Згодна законадаўства аб накіраваньні інвалідаў на працу, Інспэкцыя працы прапануе вам выдаваць давядку Васільеву аб заступленьні яго на рабоце жыць анулюна пад. На працы пазіцыць тов. Капавалаву».

Загадчык кіно-тэатру і на гэты раз па суперечыў. Ён усё зрабіў «згодна законадаўства» барысаўскай Інспэкцыі працы. Паступіла перадышка.

Толькі ці на доўга?...

... 8 верасьня на стале загадчыка кіно тэатру зноў зьявілася знаёмы штамп, знаёмы подпіс знаёмага аўтара:

«У сувязі з тым, што высьвятліліся новыя акалічнасьці (?) па справе замены кар трэлёра Васільева, прапануецца вам зараз жа адняліць на працу апошняе, вызваліць ад працы ў вас класіру Клябанаву і накіраваць яе на працу ў Загатзбожжа. На месца апошняга прызначыць тав. Паўлоўскага».

Інспэкцыя працы ня церпіць ніякай цягаціны і адтэрміноваваньня. Прыведзенае вышэй распараджэньне прапануецца выканаць не пазьней 11 верасьня.

Прачытаўшы гэту дырэктыву, загадчык кіно-тэатру засумаваў. Больш таго. Ім апанаваў жах. І ня дзіва: ён зразумеў, што Інспэкцыя працы далёка выйшла за межы сваіх функцый, што яна кампэтэнцыі урэгулюецца ва ўнутраныя справы адміністрацыі кіно-тэатру. Яна дакладзіць да таго, што з выключнай дакладнасьцю разьмяркоўвае ўсе пасады ў кіно-тэатры паміж канкрэтнымі асобамі. А што калі заўтра, згодна свайго законадаўства, барысаўская інспэкцыя працы запрапануе загадчыку кіно варыць у сябе дома боршч з цукрам, а гарбату з хрэнам?..

Гэта пытаньне яшчэ і сёньня хвалюе Бандэрдорфа. А вось работніцу друкарні—вылучыку тав. Клябанаву хвалюе іншае пытаньне:

— Што процістаў «законадаўству» барысаўскай Інспэкцыі працы, у результаце якога яна была накіравана на [illegible] працу ў Загатзбожжа, а потым у банк, дзе ля не—малапісьменнай работніцы—таксама не знайшлося працы і таму яна ўжо вось трэці месяц бесцрацоўная?

Не хваляюцца толькі ў Інспэкцыі працы. Там—усё ў парадку: і людзі на месцы і нават галовы ў іх як і належыць, на шыі...

Як-жа інакш? Трэба-ж на чым небудзь шапку пасіць.

Я. Іванькін.

Сын, брат і добры прыяцель злачынцаў

(Ліст калгасьнікаў)

Каб мець уяўленьне аб тым, наколькі кіраўніцтва калгасу «Новы шлях» (Асташкавіцкі сельсавет, Мазырскі раён) цікавіцца арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньнем калектыўнай гаспадаркі, прывядзем некалькі найбольш характэрных фактаў.

Арганізацыя брыгад у гэтым калгасе адбылася толькі на паперы. Ніхто ня вёў уліку іх працы, ні адзін калгасьнік ня ведаў колькі ён выпрацаваў і колькі зарабіў. На ўсіх галінах гаспадаркі панае абазьлічка: ні зямельныя вучасткі, ні рабочая жывёла, ні сельска-гаспадарчыя машыны і інвэнтар не прымацаваны да пэўных брыгад, да калгасьнікаў. Хто што хацеў, той тое браў, ніхто ні за што не адказваў.

У рэзультаце — толькі за апошні час у калгасе сламаны два плугі, зьнішчана некалькі пар пастромкаў, вывезеныя са строк дзьве пары коней зьніш 2-х месяцаў не запрагаліся.

Выдача авансаў і разьмеркаваньне ўраджаю рабілася на аснове кулацкай ураўнылаўкі. Старшыня калгасу Яскавец Ф. злосна ігнараваў дырэктывы аб тым, што «хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае». У часе авансаваньня калгасьнікаў бульбай адказны за гэту работу Клялоў Яўхім узяў сабе зьніш нормы каля 700 кгр. бульбы. Такім-жа паводзінам ён даў бацьку і брату Яскаўца Ф. Апошні аб гэтым ведаў, але... як сын, брат і добры прыяцель злачынцаў ніякіх мер ня прыняў.

Ды ці-ж можна было чакаць ад яго якога-небудзь рэагаваньня, калі ў яго самога «рыльца ў пушку»? Яскавец часта са сваім дзядзькам (да рэчы, адначасобнікам) сярод ночы адмывалі калгасны млын, малолі ў ім збожжа а памол... прысвойвалі сабе.

Не адстае ад свайго начальніка і загадчык сьвінагадоўчай фэрмы Данілаў. З прычыны яго бязьлітасьці, сыстэматычнага п'янства, сьвінафэрма калгасу не ўкамплектавана, корм для сьвіней і парсят разворацца хаваецца і сырой вадой, у выніку чаго за апошні час у калгасе зд[illegible] 5 старых сьвіней і 31 шт. маладняка. Корм для сьвінафэрмы выдаецца бяз уліку.

Яшчэ адзін факт, які характарызуе адносіны Яскаўца да калектыўнай гаспадаркі. Летам, у часе ўборкі, жадаючы выратаваць калгасны авёс ад дажджу, калгасьнікі вынесьлі прапанову арганізаваць суботнік. Але іх прапанова не аж цьвілася толькі таму, што кіраўнікі калгасу захацелі паехаць і паехалі... лавіць рыбу. Значная частка аўса згніла.

Такіх прыкладаў можна было-б прывесьці нямала. Але-ж ня ў гэтым справа. Важна вецаць, дзе хаваюцца прычыны ўсіх гэтых злачынных спраў.

— Прычыны? Вось яны: Яскавец Ф., які зараз кіруе калгасам — сын буйнога кулака-тандыяра, уласьніка крамы, млына, крупадзёркі, эксплёататара батрацтва і бедноты.

Калгасьнікі.

Калістратава чакае лаўка падсудных

Мы—былыя бяспрытульныя, а зараз—выхаванцы першай усебеларускай дзіцячай камуны, якая знаходзіцца ў Магілеве, добра разумеем, што гэта камуна, як і іншыя дзіцячыя ўстановы існуе для таго, каб выхаваць з нас актыўных будаўнікоў сацыялізму.

Вось чому мы просім рэдакцыю выслаць у нашу камуну свайго прадстаўніка, каб праверыць тую работу, якую праводзіць кіраўніцтва нашай камуны.

Нам здаецца, што дырэктар камуны Калістратаў—кулак, або які іншы клясавы ворог. Мы пераканаліся, што ён носіць партыйны білет выкрадзена, што ён ня мае права адказваць за выхаваньне малодога пакаленьня.

Наша перакананьне выжае вось з чаго: Калістратаў увесь час клапаціцца толькі аб сабе, яго менш за ўсё цікавіць наша выхаваньне. Ён, як, павук, абсмоктвае нашу камуну. Выдаткаваньне прадуктаў у камуне пастаўлена бескантрольна, Калістратаў і яго блізкія бяруць сабе ўсё, што захочуць. Калістратаў жорстка заціскае самакрытыку. Ён ускрывае нашыя заметкі, якія мы пасылаем у рэдакцыю.

Гаспадарка камуны знаходзіцца ў самым дрэнным становішчы: дахі пранякаюць, столі гніюць, каровы і коні дохнуць, машыны іржавеюць пад адкрытым небам. З прычыны безгаспадарчасьці адміністрацыі абкрадзена наша кладоўка, у рэзультаце чаго мы амаль зусім не забясьпечаны зімовай вопраткай і абуткам.

Тыя грошы, якія адпускаюцца на ўтрыманьне нашай школы, як правіла скарыстоўваюцца не па прызначэньні.

У школе вельмі дрэнна пастаўлен догляд хворых вучняў—утрымліваў камуны. Часта апошніх пягаюць за каўнер і кідаюць на зямлю. І ўсё гэта робяць кіраўнікі камуны. Ня раз былі выпадкі калі пасьля такіх «выхаваўчых мэтадаў» хворыя вучні трацілі прытомнасьць.

Просім як мага хутчэй праверыць усе гэтыя факты і пазбавіць нас ад такіх кіраўнікоў і выхавацеляў.

Гарбачоў, Асіпоўна, Тумараў, Яшын, Качан, Саковіч.

***

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Паведаўшы камуну, мне ўдалося ўстанавіць, што ўсе факты, прыведзеныя ў лісьце Гарбачова, Асіпенкі і інш., поўнасьцю пацьвярдзіліся.

Камуна знаходзіцца ў некалькіх кілёмэтрах ад гораду, на вачох у раённага аддзелу народнай асьветы, на вачох раённага камітэту партыі. Трэба, каб яны неадкладна зацікавіліся становішчам камуны і зрабілі належныя вывады.

Зламаць бюракратычныя адносіны да скаргаў чырвонаармейцаў

ЦВК-НК РСІ СССР у сваей дырэктыве аб праверцы чырвонаармейскіх скаргаў патрабавала ад усіх арганізацый разглядаць чырвонаармейскія скаргі і скаргі іх сем'яў у першую чаргу і ў тэрмін ня вышэй 7 дзён прыцягваючы да адказнасьці канкрэтных вінаватых у невыкананьні закону ўрэду аб ільготах і дапамозе сем'ям чырвонаармейцаў.

Праведзеная праверка ЦВК-НК РСІ па цэнтральных установах і па г. Менску паказала, што гэта дырэктыва ня выконваецца ў многіх наркаматах. Выяўлен рад нядбайных, нявуважлівых адносін да гэтых скаргаў, што сьведчыць аб непаадэкватнасьці і неразуменьні палітычнага значэньня гэтага пытаньня. Амаль ва ўсіх наркаматах адсутнічае ўлік чырвонаармейскіх скаргаў, праверка выкананьня і адказнасьць за гэтыя справы.

Папулярызацыя закону аб ільготах не праводзілася. Асобныя наркаматы абмяжоўваліся выключна разасланьнямі дырэктывамі, на чым і скончылі сваё кіраўніцтва (Наркамсабес). У выніку гэтага мы маем па менскім сабесе наступнае: рад сем'яў чырвонаармейцаў, якім была прызначана пэнсія, на працягу паўгодзьдзя і больш не атрымоўвалі, бо ім не паведамлялася пра задаваленьне іх хадайніцтва аб прызначэньні пэнсій (Сягальчык, Баркан, Шкіцешка, Петрашкевіч). Гэтыя сем'і лічыліся па сьпісах сабесу мёртвымі душамі, а калі нашы брыгадзіры пайшлі да іх, выявілася, што гэтыя сем'і зьяўляюцца рэальна існуючымі. Напрыклад, маці чырвонаармейца Гурвіча даведалася аб прызначэньні ёй пэнсіі і атрымала яе праз тыдзень па прыходзе сына з арміі. Есьць выпадкі незаконнага адмаўленьня ў пэнсіі быццам-бы таму, што права на ільготу маюць ільготнікі (Штэйн, Кучынскі).

Гарсабес не правярае працы сельсавету па выдачы апошнім пэнсій і, як вынік, скаргі на неатрыманьне пэнсій цягнуцца па 3—4 месяцы. Есьць выпадкі, калі скаргі вынашаюцца на працягу 4 — 5 месяцаў (райкалгасабес), калі фармальна адносіцца да гэтай справы. Вельмі цікавы адказ сакратара райкалгасабесу у Менску нашаму брыгадзіру: «Скаргіцца той, хто ня хоча працаваць, а таму няма чаго клапаніцца аб гэтых скаргах». Гэта сьведчыць аб палітычнай блізарукасьці і неразуменьні сутнасьці гэтага пытаньня, як пытаньня далейшага ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Асабліва дрэнна з рэалізацыяй скаргаў чырвонаармейцаў у Менгарсавеце. Гэта пытаньне ні разу ня ставілася на пасяджэньні прэзыдыуму. Да гэтага часу ня вылучылі члена прэзыдыуму, адказнага за гэту справу. Улік пастаўлен так дрэнна, што няма ніякай магчымасьці праверыць рух чырвонаармейскіх скаргаў. Такі-ж малюнак мы маем у Наркампрацы, Наркамфіне, Наркамземе. У НКСнабе ня толькі няма адказных за рэагаваньне на скаргі, але і пастаяннага ўліку. Нават асобныя працаўнікі ня ведаюць аб існаваньні пастановы ЦВК СССР ад 7-VII.

Лепш справа стаіць у НКЮ і пракуратуры рэспублікі. Там больш адносіцца ўвагі выкананьню законаў аб ільготах ваеннаслужачым. Пракуратура правяла праверку ў некалькіх раёнах, вядучы рашучую барацьбу з парушальнікамі рэвалюцыйнай законнасьці, з бюракратызмам, цягнінай пры выкананьні чырвонаармейскіх скаргаў, у выніку чаго прыцягнула да адказнасьці па партыйнай лініі, праз РБК — 23 чал. і да крымінальнай — 36 чал.

Вялікім недахопам зьяўляецца тое, што НКЮ не папулярызавае сваіх мерапрыемстваў, не скарыстаў суцэльных працэсаў для выхаваньня нізавых працаўнікоў, вырашаючы скаргі ваенна-служачых і іх сем'яў. Таму шмат выпадкаў, калі рэпрэкуратура не вялае рашучай барацьбы з бюракратызмам, нават сама дапускае бюракратызм і цягніну (за што быў прыцягнут да крыміналь

ГЕРМАНСКІ ПРАЛЕТАРЫЯТ АГРАБЛЕН НА 23 МІЛЬЯРДЫ МАРАК

БЭРЛІН, 27. У гарновым нумары «Фінансе Палітыше Корэспандынс», які выйшла вядомым эканамістам Кучынскім, указваецца, што ў лістападзе адбылося далейшае нагрэванне становішча рабочай класы Германіі. Сярэдняя тыднёвая зарплата прамысловага рабочага складала ў лістападзе 21 марку супроць 21,05 марк у кастрычніку і 26,95 марк у лістападзе 1931 г. (марка 46 кап.). Такім чынам, зарплата ў лістападзе была амаль на 30 проц. нізкай леташняй зарплаты.

Каб падняць зарплату па ўзровень афіцыяльнага пражыткавага мінімуму, яе трэба павялічыць у будаўнікоў на 233 проц., тэкстыльшчыкаў — на 144 проц., у металістаў — на 113 проц., у хімікаў — на 72 проц., друкароў — на 45 проц. Агульнае скарачэнне зарплаты прамысловых рабочых, пачынаючы з лінеі 1929 году (вышэйшы ўзровень зарплаты пасьлявоеннага часу) склала каля 23 мард. марак. Да гэтага лічэнства дзяржаўную дапамогу па беспрацоўі атрымлівалі толькі 12 проц. агульнай колькасьці беспрацоўных, у той час як яшчэ ў лістападзе 1931 году гэтую дапамогу атрымлівалі 27 проц. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў мінулы годзе памер дапамог быў значна вышэйшы, чым у гэтым годзе (ТАСС).

1-ГА СТУДЗЕНЯ—РАБОЧЫ ДЗЕНЬ

Растлумачэньне Наркамправы СССР

У сувязі з пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савнаркому СССР аб пераводзе сьвяточных дзён сьнежня на 1 студзеня 1933 г., НКЮСТ СССР і УсеЦВК растлумачаюць, што 1 студзеня зьяўляецца рабочым дзнём і днём адпачынку. Перадпрадпрыемствы выходнага дня на 1 студзеня 1933 г. не прызначаецца.

КЛАПАЦІЦЦА АБ ПАСАЖЫРЫ

Загад тав. Андрэева

Наркам шляхоў зносін тав. А. А. Андрэеў падпісаў учора загад, у якім намечаны мер для палепшэньня абслугоўваньня пасажыраў. Не пазьней 1 мая ўсе хуткія цягнікі дзелёкага сьлед.сьня павінны быць забясьпечаны вагонамі-рэстаранамі. У тых хуткіх цягніках, у якіх няма вагонаў-рэстаранаў, пасажыры будуць снабжацца халоднымі закускамі, чаем, кавай і іншымі прадуктамі ў спэцыяльных куп-буфетах.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Менск—усесаюзны цэнтр барацьбы са сквэрмай

Два гады таму назад па дакладу аўтара гэтых радкоў у Харкаве, у калегіі пры наркамаце аховы здароўя УССР аб стварэньні Усесаюзнага інстытуту па вывучэньні сквэрмы было ўстаулена, што такі інстытут патрэбен і месцам яго знаходжэньня павінен быць Менск.

Пасьля гэтага на нарадзе ўпаўнаважаных пры наркамаце аховы здароўя БССР было пастаноўлена вылучыць аўтара для арганізацыйнай работы, звязанай з атварэньнем у Менску Усесаюзнага цэнтру па барацьбе са сквэрмай.

Менск дамог шмат чаму як у сваёй ідэйнай вылучэньні і лічэньні гэтай хваробы, так і бактэрыялогіі, эпідэміялогіі. Да работы вучонай калегіі і Беларускага мікрабіялягічнага інстытуту пачынаюць усё больш прыслухоўвацца ня толькі ў нас, у СССР, але і за мяжой. Прадметны рэферат аб клініцы і лічэньні сквэрмы, які фігураваў у працах нядаўна праведзенага ў Мадрыдзе міжнароднага сотрыта-дэрматалягічнага кангрэсу, вярнуў за мяжой вельмі стаўчую задачу і яму было адведзена больш паловы ўсяго тому аб сквэрме.

Вастрэйшыя пастановы на гэтым вагомым участку сэкцыяй аховы здароўя вылучэньня яшчэ адным аргументам супроць хлусьлівых крытыкаў і спекулянтаў у вароцкай нам эміграцыі ня толькі аб любога замежнае ў нас вучэньня, але і ўсякай навуковай, як і ўсякай навукова-работы ізагул.

Гэтыя дасягненьні тым больш цэнны, што яны атрыманы ў малазной ВНУ, у малой клініцы ў Менску, адным з найбольш бедных і прыгнечаных у царскай часы вобласьцей.

Украіна, якая прыняла мінулагодняе стварэньне Усесаюзнага інстытуту ў Менску, асобна конкуруе ў вырашэньні сквэрмнай праблемы з прычыны значнай распаўсюджанасьці сквэрмных агнёў у прадукцыйнай частцы УССР. Пераймаючы Украіны ў гэным пытаньні мае для нас асобнае значэньне і павінна адушыць значна большыя сілы для далейшай напружанай творчай работы ў галіне вырашэньня шэрагу навукова-практычных пытаньняў у сквэрмовай праблеме, асабліва ў галіне эпідэміялёгіі.

Пастанаўленні аховы здароўя БССР, які правіць на ўлічэньне значэньне ўзмацнэньня нам эміграцыі і сродку ужо першыя крокі ў сваёй усесаюзнага абавязкаў ды па барацьбе са сквэрмай, паўнем прапаць пакінуць вастрыё і заняць у высокавым Менску на ачо з першых месц на вывучэньні гэтай хваробы.

Праф. С. М. БУРАК.

ЖУДАСНЫ МАЛЮНАК ГОЛАДУ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 25. Інстытут па вывучэньні грамадзкай гаспадаркі выпусьціў асобным выданьнем 57 запісак беспрацоўных, атрыманых у выніку абвешчанага ім конкурсу на апісаньне сямёй беспрацоўным умоў яго жыцьця.

Усяго атрымана 774 мэмуары. Мэмуары друкаваліся на суровым выбары. Большасьць аўтараў людзі розьнічныя і настроеныя міляністы.ка. Аўтары кнігі ня скрываюць таго, што яны выкідвалі з кнігі ўсё тое, што датычыць «зьвядзеньня партыйных спрачак і разрахункаў». Ня гледзячы на ўсё гэта кніга дае жудасны малюнак галоднай Польшчы. Большасьць аўтараў бяс працы ў сярэднім ад 2 да 3 год. Некаторыя блізкі да самагубства, іншыя рабілі замах на самагубства, але былі выратаваны. Сярод аўтараў ёсьць і такія, якія задумваюцца над агульным становішчам рабочай класы і капіталістычнага ладу.

Бярэм першага попаўшага аўтара. Гэта беспрацоўны на працягу 27 месяцаў, варшаўскі будаўнічы рабочы. Да апошняга часу яго сям'я «жыла» выпадковым пікчэмным заработкам жонкі. Беспрацоўны піша: «цяжка працаваць, маючы на руках чатырох дзяцей. Жонка выглядае, як шкелет. Я пайшоў з ёй да доктара. Ён сказаў, што такога малакроўя ніколі не сустракаў. Апрача таго кроў ідзе горкам і гэта суправаджаецца моцнымі галаўнымі болямі, а галава баліць ад думкі аб тым, што будзе далей і як мы будзем жыць».

Асаблівы шмат увагі аддаюць беспрацоўныя дзецям. «Спачатку, — піша адзін беспрацоўны, дзеці плялі таму, што хацелі есьці, а матка біла іх... але калі дзеці пякалі ўсё больш гаросьней, дык яна сама расплакалася. Села на падлогу, абняла іх, прыціснула да сэрца і так абняўшыся ўсе чацьвера плакалі доўга. Потым дзеці ўжо перасталі плакаць, сталі хмурымі і маўклівымі. Іх твары сьцяжа высечаны з мурмуру, вочы шырока расплюшчаны і ў іх найвялікшы жах». Беспрацоўны кваліфікаваны металіст, які пражывае ў Чэнстахове, паведамляе наступны факт, мэтны месца ў Чэнстахове 5 сьнежня 1930 г. «Жыў рабочы з жонкай і чатырма дзяцьмі. Бацькі былі бяс працы. Адзін раз матка заробіла некалькі грошай. Яна купіла селядцоў і хлеба і пакаміла пажж дзяцьмі. Старэйшы 17-гадовы хлопчык з'еў сваю порцыю раней малодшага, але таму, што ежы было мала, ён з'еў таксама кавалак і малодшага брата. Вибухнула сварка. Малодшы орат схапіў у шпрытоцкім ножа і ўдарам у сэрца забіў брата пашавалу».

Найвялікшыя пакуты перажывае беспрацоўны ў часе даромных пошукаў работы і прастойваючы цэлыя дні ў чэргах за пакачкай. Некаторыя ў роспачы даходзяць да таго, што дужаюць выразныя шыталь.не шляхам вызваленьня ад галоднай сьмі'і.

Многія аўтары ня ўтойваюць таго, што яны расчараваліся за ўсім і ў капіталізме і ў польскай дзяржаве і ў капіталізьмо наогул.

Некаторыя лічаць, што прыдзе дзень, калі беспрацоўныя падымуцца і разбураць у роспачы ўсё. Адзін з іх піша: «Іншы раз, стоячы ў чарзе (за дапамогай), я раздумваў над цяперашнім становішчам на сьвеце. Газэты напрыклад паведамляюць, што ёсьць зьвыш дзесятка мільёнаў беспрацоўных. У сапраўднасьці-ж іх напэўна сто мільёнаў.

Як відаць з гэтага грамадзкія адносіны асабліва часьцелі для таго, каб выклікаць сусьветную сацыялістычную рэвалюцыю. І здаецца, што гэтыя вялізарныя масы галодных людзей толькі і чакаюць якога-небудзь сьмельчака, які кінуў-бы на загніваю ты сьвет гаручы факел бунту. Час пакласьці над загніваючы будынак капіталістычнага сьвету дынаміт».

Пытаньне аб СССР шырока дыскутуецца ў колах беспрацоўных. Гэта самае непрыемнае для буржуазіі пытаньне таксама не ўдаецца абыйсьці моўчкі аўтарам кнігі. Беспрацоўны, які асабіста настроен антысавецкі, піша: «Большасьць беспрацоўных праклінае ўрад, Польшчу, капіталістаў і нават бога. Большасьць сьцьвярджае, што беспрацоўе — рэзультат змовы капіталістаў і ўраду з мэтай задушыць рабочага, каб зрабіць з яго раба. Таму многія схіляюцца да камунізму. Такім чынам, беспрацоўе, лепшы саюзьнік міжнароднай рэвалюцыі, да якой імкнецца камунізм. Тысячы беспрацоўных сьцьвярджаюць, што толькі ў СССР добра жывецца і толькі бальшавіцкая сыстэма можа ліквідаваць беспрацоўе» (ТАСС).

„На працягу зімы голад працоўных перавысіць усё, што толькі было бачана ад пачатку гэтага стагодзьдзя"

ПАРЫЖ, 28. Газэты публікуюць вытрымкі з дакладу міжнароднага бюро працы пры Лізе нацый для міжнароднай канфэрэнцыі, якая павінна адбыцца 10 студзеня, па пытаньнях аб увядзеньні 40-гадзіннага рабочага тыдню. Колькасьць беспрацоўных ва ўсім сьвеце перавышае 30 млн. чал. У большасьці краін ад 25 да 33 проц. рабочага насельніцтва ня могуць знайсьці сабе працы. (Гутарка ідзе толькі аб зарэгістраваных беспрацоўных). Ва ўсіх краінах расьце новая хваля зімовага беспрацоўя. У Германіі налічваецца зараз 6 млн. беспрацоўных, у Англіі—3 млн. Даклад міжнароднага бюро працы канстатуе, што на працягу зімы «голад працоўных перавысіць усё, што толькі было бачана ад пачатку гэтага стагодзьдзя».

Потым паказваецца таны ад скарачэньні зарплаты. Страты зарплаты рабочае класы толькі ў 30 буйных краінах дасягаюць 5 млрд. францускіх франкаў.

БАІ Ў РАЁНЕ НАНЛІНУ

ШАНХАЙ, 28. Як паведамляе агэнцтва Гомін, Тай Юй-лін (старшыня ўраду Жахэ) афіцыяльна паведаміў бейпінскую ўладу, што паміж японскімі войскамі і валанцёрскімі атрадамі пачаліся баі ў раёне Нанліну і Саньбасінцы і што маньчжурскія часьці накіраваліся з Суйчкуну (на ўзьбярэжжы Лядоўнікага заліву) у напрамку да Ліпоаню (на поўдні Жахэ). Галоўныя сілы японскіх войск разгортваюць актыўную дзейнасьць ўзьдоўж граніц Жахэ. Агэнцтва таксама паведамляе, што ў Бейпіне пастаноўлена трымаць на пагатове звыш 30 тысяч войск для аховы тэрыторыі паўночнага Кітаю.

ВАЛАНТЭРЫ НАНОСЯЦЬ ЗНАЧНЫЯ СТРАТЫ ЯПОНСКІМ ГОЙСКАМ

МУКДЭН, 28. Сьледам за паведамленьнямі японскіх крыкц аб заканчэньні экспедыцыі супроць антыманьчжурскіх войск у раёнах, якія знаходзяцца паміж КУЧ і Мукдэн-Аньдунскай чыгункай японская прэса ўказвае, што становішча «рашоўна зьмянілася». Валантэрскія атрады ўзмацнілі супраціўленьне і наносяць значныя страты японскім войскам. Пасьля заняцьця японскімі войскамі базы антыманьчжурскіх войск гораду Сюяня (на поўдзень ад Мукдэну). Атрад валантэраў у складзе 5 тыс. байцоў акружыў горад, у якім застаўся невялікі гарнізон. Горад ужо на працягу двух зёён абложан валантэрамі. Паводле паведамленьня газэты «Маньчжоўна» 7 японцаў забіта і 4 паранена. Другі атрад японскіх войск таксама акружан валантэрскімі часьцямі ў складзе тысячы байцоў. Тры японцы забіты і 6 паранены. Газэта «Маньчжоўна» паведамляе, што на працягу некалькіх апошніх дзён японскія войскі ўступілі ў бой з буйнымі атрадамі валантэраў. Для зьмены сытуацыі газэта патрабуе пасылкі значных японскіх шпаўненьняў (ТАСС).

Канчатковыя даныя прэзыдэнцкіх выбараў у Амэрыцы

НЮ-ЕРК, 27. Як паведамляе агэнцтва «Асошыэйтэд Прэс» паводле канчатковых афіцыяльных даных Рузвэльт сабраў па прэзыдэнцкіх выбарах 22.815 тыс. галасоў, Гувэр — 15.759 тыс., кандыдат сацыялістаў Томас — 882 тыс. і кандыдат кампартыі Фостэр — 102.785 галасоў. На мінулых прэзыдэнцкіх выбарах за Фостэра было падана паводле афіцыяльных даных 48.770 галасоў. Трэба ўлічыць, што мільёны рабочых і фэрмэраў у тым ліку масы беспрацоўных і пэраў былі пазбаўлены права галасаваньня. У некаторых штатах была забаронена падача галасоў за камуністаў, а ў іншых многія галасы, сабраныя камуністычнымі кандыдатамі, ня былі залічаны. Пры падліку галасоў мелі месца розныя злоўжываньні, часткова выкрытыя на радзе судовых працэсаў у розных гарадох.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 73

Менскага гарадзкога савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

19 сьнежня 1932 г. г. Менск.

АБ АДКАЗНАСЬЦІ ЗА ПАРУШЭНЬНЕ ГРАМАДЗКАГА ПАРАДКУ У г. МЕНСКУ

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Забараніць на ўсіх вясцох грамадзкага карыстаньня ў гор. Менску, як-то: у памяшканьнях устаноў, на вуліцах, плошчах, сядох, сьцежках, трамваю, аўтобусах, тэатрах, кіно, клюбах, сталовых, чайных, магазынах і іншых парушаць агульны парадзік і цішыню крыкам, лаянкай і бойкай.

2. Вінаватых у парушэньні гэтай абавязковай постановы прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасьці—штрафу ў разьмеры 3-х руб., які стягваецца на месцы пасьля міліцыянэрам або членам брыгады сяброўскага кантролю, з абавязковай выдачай квітанцыі аб уплаце штрафу, а ў выпадку адмаўленьня складаецца пратакол для накладаньня штрафу да 15 руб. або 3-х дзён прымусовай працы.

3. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на рабоча-сялянскую міліцыю.

4. Абавязковая пастанова набывае моц праз 7 дзён з дня апублікаваньня.

Нам. старшыні гарсавету НАРАНЕЎСКІ.
Сакратар гарсавету ЖАДЬКО.

УСІМ ПАДПІСЧЫКАМ І ЗАБЫЎШЫМ ПАДПІСАЦЦА

НАПАМІНАЕМ

на 1933 г. ШТО АДКРЫТА ПАДПІСКА НА Ч СОЦІ на 1933 г.

„ПРЕДПРИЯТИЕ"

Вялікая ілюстраваная гасэтахіўнанае часопісь „ПРЕДПРИЯТИЕ" зьяўляецца, шырокім кіраўніцтвам для кожнага дырэктара прадпрыемства, аддзелу, цэху і майстэрні. „ПРЕДПРИЯТИЕ" дае лепшыя формы і метады арганізацыі і кіраўніцтва ў вытворчасьці, асьвятляе навейшыя дасягненьні прадпрыемстваў.

„СТРОИМ"

у фотадакумэнтах, малюнках і літаратурных матэрыялах паказвае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва краіны.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

	1 месяц	3 месяца	6 месяцаў	12 месяцаў
„СТРОИМ"	— 90 к.	2 р. 70 к.	5 р. 40 к.	10 р. 60 к.
„ПРЕДПРИЯТИЕ"	— к	6 р. — к.	12 р. — к.	24 р. — к.

У раздробным продажы цана асобнага нумару „Предприятия" — 1 р., „Строим" — 30 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: газэтнымі бюро „Союзпэчаты", усімі лістаносьмі, паштовымі аддзяленьнямі, мясцовымі кнігарнямі ды вытворчымі арганізацыямі падпіскі на прадпрыемствах і ў установах.

Падпіску здавай не загадзя.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Кроны мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ — Касы—ад 12 г. дня

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Занемы мастацкі фільм Пасынкі Берліну — Касы—ад 12 г. дня

Пралетары — ВЫСПА ТОГУЙ — дрэмы ў 6 частках. Дзённыя дзіцячыя сэансы ПЕРШАЯ КОННАЯ

СПАРТАК — Касы—ад 1 г. дня. Мастацкі фільм ЧАЛАВЕК ЗА БАРТОМ Кіно-п'еса ў 6 частках

АНОНС! ГЭТЫМІ ДНЯМІ АДКРЫВАЕЦЦА першы ў Беларусі дзіцячы кіно-тэатр „Новы піянэр", Савецкая, 90 (памяшканьне былой кірхі)

„Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" КУПЛЯЕ ПІЯНІНА з прапановамі зварачацца ў кіно „Інтэрнацыянал" ад 12 гадз. дня да 11 гадз. веч.

Дом пісьменьніка (Савецкая, 68) Сёньня, 30 сьнежня, у 7 гадзін увечары адбудзецца ТВОРЧЫ ВЕЧАР Уладзімера ХАДЫКІ З дакладам выступіць Ал. Нучар. Уваход вольны.

ЗНОЙДЗЕНЫ лётарэйныя білеты 6-й лётарэі Асавіяхіму. Зварачацца ў к-ры „Зьвязды".

Беларуская фабрыка мэханізаванага лічэньня ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ ПА РАМОНТУ шчотак-пішучых, вылічальных, адлітычных машын і прафэмэтраў розных сыстэм.

Заказы выконваюцца добразнасна і ў наратні тэрмін. Прыём заказаў ад 9 гадз. раніцы да 8 гадз. вечара, апрача выхадных дзён 6, 12, 18, 24, 30.

АДРАС: гор. Энгельса 1 Камуністычная, 16, Беларуская фабрыка мэханізаванага лічэньня, майстэрня, пакой № 8. Тэлеф. 11-26.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Даводзіцца да ведамы ўсіх прадпрыемстваў і Устаноў г. МЕНСКУ, што НАБОРНЫЯ КАРТКІ БУДУЦЬ АДПУСКАЦЦА сталом па выдачы наборных дакумэнтаў з 30-XII па 3 студзеня 1933 г.

Пры раздачы картак на прадпрыемствах і ўстановах патрэбна выдаваць у першую чаргу па 3-му сьпісу і-а і 2-а катэгорыі бо хлеб па 3-му сьпісу будзе выдавацца па старым картках толькі да 3-I—1933 г.

Па 1-му і 2-му сьпісам хлеб будзе адпускацца па старым хлебным кніжкам да 6-I—1933 г.

Гарсавет ГАНТМАН.
Заг. бюро наборных дакумэнтаў ШАПАТНОЎСКІ.

Да ведамы ГАРАНА, РАЙАНА і ЎСІХ НАСТАЎНІКАЎ.

Новыя праграмы I і II канцэнтру ВЫШЛІ З ДРУКУ

І 29, 29 СЬНЕЖНЯ БАЗАЙ ДЗЯРЖАЎНАГА ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ РАЗАСЛАНЫ

ПАШТОВЫМІ ПАСЫЛКАМІ НЕПАСРЭДНА У АДРАС ГарРайАна.

Серыя на атрымаўшае іх з пошты.

Праграмы высланы без накладной платы. Кошт апошніх павінен быць аплачаны на рахунках ДВБ. Калі высланы асобным пакетам накладная плацёж адпаведна кошту праграм.

У выпадку навыхаду рахункаў, БУДЗЕ СПЫНЕНА ДАЛЕЙШАЯ ВЫСЫЛКА ПАДРУЧНІКАЎ І ЛІТАРАТУРЫ.

НАРДАМАСВЕТЫ БССР.

З КАНЦА БЯГУЧАГА 1932 ГОДУ Інстытут эканомікі Беларускай Акадэміі Навук ПРЫСТУПІЦЬ ДА ВЫДАНЬНЯ БІБЛІЯТЭКІ ПЯД НАЗВАЮ „ЭКАНАМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА" пад рэдакцыяй прафэсара Т. Ф. ДОЎБАЛЯ.

„ЭКАНАМІЧНАЯ БІБЛІЯТЭКА" будзе складацца з пяці наступных сэрый:

I-я сэрыя — Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін;
II-я сэрыя — „Эканамічная школа";
III-я сэрыя — працы інстытуту эканомікі;
IV-я сэрыя — навукова-папулярная
V-я сэрыя — Эканамічна-тэхніч. бібліятэка

Выданьне разлічана на 3 гады і будзе заключаць у сябе каля 100 аркушаў у сотні дзесяці аркушовых выпускаў. Гэта выгадзе працы „Эканамічнай бібліятэкі" паступаюць у продаж па ўсе магазыны Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі і БАКТ.

На ўсе сэрыі адкрыта абанэмэнтная падпіска. Зварачацца па адрасе: Менск, Беларуская Акадэмія Навук.

Цікавы вопыт

3.500 рахункова-статыстычных работнікаў на зьдзельшчыне

Беларускі саюзаргупін на працягу 1932 г. прарабіў МАСАВЫ ВОПЫТ ПЕРАВОДУ РАХУНКОВА-СТАТЫСТЫЧНЫХ АПАРАТАЎ НА ПРОСТУЮ ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ.

Усебеларуская канфэрэнцыя работнікаў рахункова-статыстычных апаратаў ТЫБ і аддзелаў эканомікі і працы буйнейшых прадпрыемстваў БССР падагуліла вынікі гэтага вопыту. Усяго ПА БССР ПЕРАВЕДЗЕНА НА ЗЬДЗЕЛЬНУЮ АПЛАТУ ПРАЦЫ 3.500 РАХУНКОВА-СТАТЫСТЫЧНЫХ РАБОТНІКАЎ У 600 УСТАНОВАХ І ПРАДПРЫЕМСТВАХ. Выяўлена наступная эфэктыўнасьць ад гэтага мерапрыемства: штат работнікаў скарочан на 17,6 проц. Плацёжная адстаёвае ва ўніку на 31,400 чалавека-дзён. З'эканомлены фонды зарплаты на 940 тыс. руб., значна палепшылася якасьць работы.

У той-жа час узьнят сярэдні заработак работнікаў, пераведзеных на зьдзельшчыну, на 12,1 проц.

Гэтыя вынікі поўнасьцю пацьвярджаюць правільнасьць лініі партыі і ўраду на ўкараненьне злэкчовальных форм аплаты ва ўсіх галінах працы. Усебеларуская канфэрэнцыя закліча ўсіх работнікаў уніку СССР прыступіць ДА БЕЗАДКЛАДНАГА ПЕРАНЯСЕНЬНЯ Ў СВАЕ АПАРДАТЫ ВОПЫТУ БССР ПА ПЕРАВОДЗЕ РАХУНКОВА-СТАТЫСТЫЧНЫХ РАБОТНІКАЎ НА ЗЬДЗЕЛЬНУЮ АПЛАТУ.

Электрамагнэсавы апарат доктара Абрумянца

На адным з апошніх пасяджэньняў менскага хірургічнага таварыства гомельскі доктар АЕРУМЯНЦ дэманстраваў сканструяваны ім электрамагнэсавы апарат.

Пры дапамозе гэтага апарату доктар Абрумянц дастаў з бронхаў дзіцячы мэталічны вінт.

Пасьля апэрацыі дзіця паправілася і ачуняла. Калі-б гэтай апэрацыі не зрабілі, яно загінула-б ад гнойніка пёгкіх.

Паведамленьні

— 31 сьнежня г. г., у памяшканьні вурэйскага дзяржаўнага тэатру (б. кіно «Культура») адбудзецца АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ ГЕРОЯЎ ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ з уручэньнем ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ гор. Менску, прысьвечаны СУСТРЭЧЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ — пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Пачатак роўна ў 6 з пал. гадз. вечара. Білеты разьмяркоўваюцца ГСПС.

Менгарком КП(б)Б.
Менгарком ЛКСМБ.
Гарпрафсавет.

— Даводзіцца да ведамы ўсіх таварышоў, падаўшых заявы ў вячэрні камуністычны інстытут журналістыкі, што 29 і 30 сьнежня яны павінны прайсьці іспыты, якія будуць адбывацца ў памяшканьні ВКСГШ (былы Камвуз) Універсытэцкая, 27, 3-ці паверх, 62 пакой, роўна ў 8 гадз. вечара.

— Бел. адзяленьне таварыства старых бальшавікоў абвяшчае па г. Менску перарэгістрацыю ўсіх палітбальшчыкаў—членаў КП(б)В да 1916 г. уключна. Перарэгістрацыя будзе праводзіцца 2, 3, 4 і 6 студзеня 1933 г. у памяшканьні Наркаменабу БССР (3-ці паверх, пакой № 40 ад 6 да 8 гадз. вечара.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Вышэйшая Камуністычная Сельска-Гаспадарчая Школа Беларусі імя Леніна

паведамляе, што іспыты на 2-хгадовае аддзяленьне ВКСГШБ будуць праводзіцца з 2 да 5 студзеня 1933 г.

Усе вылучэньні на вучобу ў ВКСГШБ гарнкомамі і райкомамі таварышы павінны зьявіцца на іспыты 2 і 3 студзеня 1933 г. у гор. Менск, Універсытэцкая 27, пакой № 29.

Тыя таварышы, якія падалі заявы без рэкамэндацыі партыкомаў або іншых арганізацый, павінны зьявіцца на іспыты з камандыроўкамі партыкомаў.

Райкомы КП(б)Б, якія не выканалі разьвёрстку па адборы ў ВКСГШБ, павінны зараз жа вылучыць таварышоў, згодна правіл прыёму і разьвёрстці, і накіраваць іх разам з рэкамэндацыямі на іспыты не пазьней 5-га студзеня 1933 г.

Дырэктар ВКСГШБ Аўчынікаў.

ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАНЬНЯ ПАРТАКТЫВУ пры ЦК КП(б)Б

РАСКЛАД

РАДЫЁ-ПЕРАДАЧ НА МЕСЯЦ СТУДЗЕНЬ 1933 г.

Лекцыі перадаюцца штодзённа (апрача 6, 12, 18, 24 і 30) увечары а 19 гадзіне і паўтараюцца назаўтра раніцою а 10 гадзіне праз Менскую радыё-станцыю РЗ—10, хв. дз 1105 мэтраў.

(Абазначэньні у раскладзе кожны раз папярэдне паведамляецца)

Раённыя партыйныя камітэты павінны прыняць усе меры да забясьпечэньня необходзных умоў для прадукцыйнай работы завочнікаў, у прыватнасьці прадастаўленьня завочнікам дадатковых трох свабодных дзён у месяц і прадастаўленьня часу для наведваньня радыё аўдыторый і курсаў-канфэрэнцый.

Абавязаць раённых партакітэтаў прымацаваць да кожнай радыё аўдыторыі прапагандыста-кансультанта, абавязкі якога прапарцоўка і растлумачэньне завочным перадаваемых лекцый, а таксама сыстэматычны вучот і кантроль за акуратным наведваньнем радыё-лекцый.

(З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 7-VII—1932 г.).

I. Завочны камуністычны ўнівэрсытэт

5-I. Палітэканомія—„Імпэрыялізм як вышэйшы этап капіталізму" (1-я лекцыя).

11-I. Палітэканомія—„Імпэрыялізм як вышэйшы этап капіталізму" (2-лекцыя).

17-I. Гісторыя рэвалюцыйнага руху—„Ленін у барацьбе з рэфармізмам і цэнтрызмам у 2-м Інтэрнацыянале".

23-I. Палітэканомія—„Усеагульны крызіс капіталізму".

29-I. Прыродазнаўства—„Паходжаньне чалавека".

II. Завочная саўпартшкола

2-I. Палітэканомія—„Гандлёвы і пазычковы капітал".

3-I. Прыродазнаўства—„Прыродазнаўства—на службу сацыялістычнай сельскай гаспадаркі".

14-I. Бэлетэка—Кансультацыя па заданьнях.

20-I. Палітэканомія—„Зямельная рэнта".

28-I. Гісторыя рэв. руху—(на ўрэйскай мове) „Жабінская дыктатура".

УВАГА: Завочнікі ўрэйскай ЗСПШ слухаюць лекцыі 14 і 25 студзеня.

III. Цыклявыя радыё-лекцыі

для ўсіх форм завочнай партвучобы

1. „Барацьба партыі на два фронты на асноўных этапах пе гісторыі"

У студзені перадаюцца апошнія тры лекцыі гэтага цыклю — 3, 18 і 31 студзеня.

2. „СССР на шляхох вызваленьня ад тэхнічнай залежнасьці ад капіталістычных краін".

Цыкль распачаты ў сьнежні. Лекцыі гэтага цыклю слухаюць 13 і 26-га студзеня.

3. „Пад сьцягам Леніна наперад да новых перамог" 19 і 21 студзеня.

4. Перадача для настаўніцтва.

„Асноўныя прынцыпы работы школ па новых праграмах"—28-га студзеня.

IV. Эпізодычныя радыё-лекцыі

для ўсіх форм завочнай партвучобы

1-I.—„СССР перад новым гаспадарчым годам—першым годам 2-й пяцігодкі"

4-I.—„Адказы на пытаньні, якія надаслалі завочнікі.

7-I.—„Задачы партчэек прадпрыемстваў па рэалізацыі пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) па арганізацыі таварыш. шырокапрыцяжу".

9-I—„Сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б аб павышэньні ўрадзайнасьці".

27-I.—Лекцыя для кампалітскладу РСЧА.

V. ІНСТРУКЦЫЙНЫЯ ПЕРАДАЧЫ для работнікаў сыстэмы завочнай партасьветы

(кансультантаў, рэвізантаў, райрарганізатараў, прапагандыстаў і г. д.)

10-I.—„Гутарка, як асноўны мэтад заняткаў у нізавой сетцы партасьветы".

21-I.—„Як будзе арганізавана завочная партвучоба ў 1933 г."

VI. Інфармацыйная перадача ІМЗО пры ЦК КП(б)Б аб становішчы завочнай партвучобы—15-га студзеня.

Да ўвагі завочнікаў і радыё слухачоў

Перадачу лекцый, паказаных у гэтым раскладзе, слухайце ў спэцыяльна-абсталяваных радыё-аўдыторыях, якія знаходзяцца ў партпалітвузах, на тэрыторыі сельсаветаў, калгасаў, буйных прадпрыемстваў і г. д. У гэтых аўдыторыях завочнікі павінны атрымаць кансультацыю па прадметах праслуханых лекцый і усе матэрыялы аб завочнай партвучобе.

Усе пытаньні, пажаданні і заўвагі аб праслуханых лекцыях, як вучэбных, так і эпізодычных, пасылайце па адрасе: гор. Менск, вул. Карла Маркса 30-47, пакой 6, ІМЗО пры ЦК КП(б)Б.

Нам. дырэктара ІМЗО пры ЦК КП(б)Б Ш. ЭПІЭТЭЙН.

Тав. ЗАВОЧНІКІ! Гэты расклад выраз і рэгулярна слухай прызначаныя для цябе лекцыі.

Менск, друкарня «Зьвязды».